№ 21 (523) 8 чэрвеня 2007 www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА ISSN 1819-1614

Заснаваная ў лістападзе1906. Адноўленая ў траўні 1991. Выдавец: Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы». Выходзіць штотыднёва, у пятніцы

### Мілінкевіч стрэўся з Бушам

Лідэр дэмакратычных сіл нароўні з прэзыдэнтамі браў удзел у міжнароднай канфэрэнцыі «Дэмакратыя і бясьпека» ў Празе. **Старонка 11.**

### Мэр для народу, а не народ для мэра

«Мы — улада, нам трэба карміць людзей», — так Міхаіл Паўлаў адказаў тым, хто змагаецца супраць перадачы Бэрнардынаў пад гатэль. **Старонка 12.**

### Права лета

Уводзіны ў моду летняга сэзону. Піша Тэда Лі. **Старонка 22.**

# Беларусь робіцца аб'ектам барацьбы

Сустрэча G8 — што новага для сьвету і для Беларусі? Піша Алесь Кудрыцкі.

У сераду ў нямецкім мястэчку Гайлігендам распачалася сустрэча лідэраў краінаў «Вялікай Восемкі» («G8»). Галоўная інтрыга саміту — ці ўдасца Ангеле Мэркель пераканаць Джорджа Буша змагацца супраць кліматычных зьменаў разам з астатнім сьветам. Беларусам жа цікава будзе назіраць за паводзінамі Пуціна. І як будуць паводзіць сябе з Пуціным.

**Старонка 14.**

# Малітва за свабоду малітвы



PHOTO.BYMEDIA.NET

**Пяць тысячаў вернікаў сабраліся ў сталіцы, каб прасіць аб зьмене закону пра свабоду сумленьня. Старонка 18.**




**15—16 чэрвеня — «Адборышча'07». 20 маладых гуртоў! Спэцыяльныя госьці «Сьцяна» і «Б:Н:» Даведкі: 6490888, 7662425**

# «Для Беларусі сцэнар можа быць жорсткі»

У інтэрвію журналістам краінаў G8 У.Пуцін паведаміў, што за атрыманьне Кіевам у 90-я газу па льготных цэнах, расейскі газ для ўкраінцаў у будучыні будзе прадавацца па цэнах, вышэйшых за рынкавыя на 12—17%. Залежнасьць Беларусі ад паставак расейскага газу большая. Ці ня ёсьць гэта нагодай для паўтарэньня агучанага расейскім прэзыдэнтам сцэнару ў дачыненьні да Беларусі? Камэнтар экспэртаў.

**Тацяна Манёнак, аглядальнік газэты «Белорусы и рынок»:** Цаной працяглых перамоваў беларусы атрымалі лагодныя і празрыстыя ўмовы паставак газу на наступныя чатыры гады. Асаблівасьці міждзяржаўных адносінаў не дазволяць Расеі ў найбліжэйшай пэрспэктыве выставіць Беларусі такія патрабаваньні. Украіна ўжо вызначылася ў сваім кірунку, здаецца, незваротна. Гэтым і тлумачыцца стаўленьне Расеі. Беларускае кіраўніцтва пакуль ня мае акрэсьленай канцэпцыі напрамку разьвіцьця краіны. Вядзецца гульня, гандаль за лепшыя ўмовы. Такая сытуацыя пакуль задавальняе абодва бакі.

**Віталь Сіліцкі, палітоляг:** Украіна атрымлівала з Расеі толькі 20% газу, дый тое кампэнсавала яго кошт паслугамі за транзыт. Беларусь на 100% залежыць ад паставак расейскага паліва. Таму ў нашым выпадку сцэнар можа быць нашмат больш жорсткі. Хіба гэты ціск ня будзе відавочны, покуль будуць дзейнічаць апошнія міждзяржаўныя дамоўленасьці.

**Натальля Тагановіч, загадчыца сэктару праблемаў паліўна-энэргетычнага комплексу Інстытуту эканомікі Беларусі:** Наша краіна мае прывабнае геапалітычнае становішча, асабліва гэта датычыць пытаньняў транзыту. Таму для нас дачыненьні з Расеяй у сфэры паставак паліва будуць у цэлым спрыяльныя заўсёды.

**Запісаў Сямён Печанко**

**КАМЭНТАР РЭДАКЦЫІ**

# Навіну ўводзіць, старыны ня рушыць

Актывісткі ініцыятыўнай групы па вяртаньні царквы Сьвятога Язэпа і манастыра бэрнардынаў Івона Мацукевіч і Ганна Сіўчык сустрэліся са старшынём Менгарвыканкаму Міхаілам Паўлавым. Яны спрабавалі даведацца пра лёс сьвятыні, якую ўлады маюць перабудаваць пад гасьцініцу і забаўляльны комплекс.

Паводле словаў Івоны Мацукевіч, кіраўнік сталіцы пацьвердзіў ранейшыя пляны адносна былых кляштарных камяніцаў.

Што датычыць храму, Паўлаў адказаў, што яго перададуць у камунальную ўласнасьць і прыстасуюць пад «аб'ект культурна-бытавога прызначэньня». Разам з гэтым, Паўлаў запэўніў, што будынак ня будзе «зьняслаўлены».

Падчас гутаркі Паўлаў спаслаўся на экспэртызу будынкаў, праведзеную Міністэрствам культуры, якая «ня выявіла ў іх нічога сьвятога».

«Калі мы папрасілі яшчэ раз падумаць, мэр сказаў, што «Мы так вырашылі, мы — ўлада, нам трэба карміць людзей», — кажа Івона Мацукевіч.

Тым часам у абарону царквы й манастыра сабралі каля 20 тысяч подпісаў. Толькі праз каталіцкую парафію Сьвятога Язэпа прайшло 10126 подпісаў, адрасаваных Адміністрацыі прэзыдэнта.

Абарона спадчыны стала гарачай тэмай за апошні год. Прычым ізноў, як перад падзеньнем СССР, незалежнае грамадзтва б'ецца тут зь дзяржавай. Горадня, Віцебск... Моладзь, інтэлігенцыя, дысыдэнты адстойваюць варыянты захаваньня старыны, «як было». Улады і капіталісты хочуць перабудоўваць і зносіць. Як мэр Паўлаў і каталіцкія актывісткі, прадстаўнікі ўладаў і грамадзкасьці глядзяць на праблему ў розных оптыках. «Нам трэба карміць людзей» і «не за адным хлебам жыве чалавек».

Беларусь перабывае ў пэрыядзе абсалютнага матэрыялізму, калі спажывецтва («рост дабрабыту насельніцтва») ператварылася ў дзяржаўную ідэю, калі грошы, прыбытак ставяцца па-над усім. А што ж іншыя каштоўнасьці, якія ня зьмераеш рублём, аб'ёмам рухавіка, квадратным мэтрам, але якія фармуюць чалавека — аснову тае ж эканомікі?

Тэма гэтага нумару «НН» — лёс архітэктурнай спадчыны.

Адкрываецца ён фотарэпартажам з Горадні. На здымках — будынкі, якіх хутка можа ня стаць.

Як падобным праблемам давалі рады ў Эўропе? Там таксама бывалі розныя падыходы, удачы і няўдачы. Грунтоўны артыкул Алеся Кудрыцкага (прыклады Рыму, Брусэлю, Кіева, іншых гарадоў у праекцыі на наш вопыт) знойдзеце на **старонцы 4**.

Як гэта можа быць іначай у Беларусі? Рэпартаж з Наваградку, дзе мясцовыя бізнэсоўцы аднаўляюць стары гатэль «Эўропа», — **старонка 8**.

* * *

На мінулым тыдні Пуцін зноў напужаў. За атрыманьне Кіевам у 90-я газу па льготных цэнах, расейскі газ для ўкраінцаў у будучыні будзе прадавацца па цэнах, даражэйшых за рынкавыя на 12—17%. Адкрыты шантаж. Тое самае заўтра пагражае й Беларусі. Эўропа думае, як быць. Між тым беларускія дзяржаўныя СМІ робяць выгляд, што нічога не адбываецца, як не заўважаюць яны і дыскусій вакол Сьвятога Язэпа, і барацьбы моладзі за старую Горадню, і продаж «Белтрансгазу». У выніку заканамерна расьце давер да недзяржаўнай прэсы **(старонка 20)**.

# Горадня, якой хутка ня будзе

Працягваецца барацьба за захаваньне гістарычнай часткі Горадні. Грамадзкасьць ладзіць вахты і зьбірае подпісы за гарадзкі рэфэрэндум. Бульдозэры ж працуюць далей.

Рэканструкцыя ў Горадні цягнецца ад 2004 г. Тады на цэнтральнай Савецкай плошчы выкарчавалі сквэр, але пакінулі савецкі танк і платную прыбіральню. Саму ж плошчу выклалі бэтоннай пліткай.

Сьледам у квартале Новы сьвет зьнесьлі ўнікальны для Горадні будынак у стылі канструктывізму.

Вясною 2007 г. гарадзкія ўлады абвясьцілі пра пляны пашырэньня Старога мосту празь Нёман. Гэта на гады замацуе ў гістарычным цэнтры вялікія транспартныя плыні. Інтэлігенцыя распрацавала альтэрнатыўны плян транспартнай сыстэмы, які прадугледжвае вывад плыні транспарту з цэнтру Горадні. Аднак 19 красавіка 2007 г. Навукова-мэтадычная рада па пытаньнях гісторыка-культурнай спадчыны Міністэрства культуры ўхваліла афіцыйныя пляны. У іх — руйнаваньне каля сарака старых аб'ектаў у гістарычнай частцы гораду. На сёньня фактычна вырашаны лёс будынкаў на вуліцах Гараднічанскай, Урыцкага, Горкага, Багдановіча, Сацыялістычнай, Васілька, Астроўскага. На працягу траўня будаўнікі амаль разабралі флігель XVIII ст. і паравы млын XIX ст. Разбураныя камяніцы на вул. Урыцкага.

Нязгодныя з плянамі ўладаў гарадзенцы ладзяць вахты побач зь меркаванымі пад знос будынкамі. Інтэлігенцыя ініцыявала правядзеньне гарадзкога рэфэрэндуму па пытаньнях рэканструкцыі. Гарадзенцы сабралі паўтысячы подпісаў пад зваротам у абласную пракуратуру.

**Сямён Печанко**



Фотарэпартаж Юліі Дарашкевіч.

Гараднічанская, 23.



Сацыялістычная, 44

Горкага, 2. Напаўразбураны флігель.





«Іншаплянэтны» пэйзаж каля штаб-кватэры Эўракамісіі, на месцы кварталаў XIX ст.

АЛЕСЬ КУДРЫЦКІ

# Мэр для народу ці народ для мэра?

Як руйнуюць у Эўропе. Піша **Алесь Кудрыцкі**.

«Quod non fecerunt barbari, fecerunt Barberini» — «што ня здужалі барбары, давершаць Барбэрыні», — змрочна жартавалі жыхары Рыму ў сярэдзіне XVII ст. Барбэрыні — багатая рымская сям’я, зь якой паходзіў тагачасны Папа Урбан VIII. У гэты час Каталіцкая царква ўжо зबольшага акрыяла ад шоку, выкліканага выбухам пратэстантызму. Контррэфармацыя, прынамсі, у раманскіх краінах, набірала тэмп. Ватыкану трэба было наноў сьцьвердзіцца, паказаць сьвету сваю адноўленую моц. Дзеля гэтага Папа Урбан VIII вырашыў радыкальна зьмяніць твар Вечнага Гораду. Безьліч старых дамоў пайшлі пад знос. Замест старога Рыму, які памятаў яшчэ часы імпэрыі, дойліды Бэрніні ды Бараміні збудавалі новы горад у стылі барока. Прычым шчыравалі яны, няйначай як канкурэнты ды амаль асабістыя ворагі, намагаючыся як далей пераплюнуць адзін аднаго ў грандыёзнасьці ды вычурнасьці новых гмахаў. І, дарэчы, ніхто нават не зьбіраўся пытацца ў паспалітых рымлянаў, ці даспадобы ім гэтае архітэктурнае спаборніцтва.

З аднаго боку, Папа Урбан VIII паўстае цынічным разбуральнікам старасьвеччыны. Зь іншага боку, гэта не замінае сёньня мільёнам турыстаў з захапленьнем імкнуцца ў Рым, дзе амаль кожны будынак (за выняткам хіба самых старажытных накшталт Калізэю) так ці інакай закрануты хвалямі барочнага цунамі. Дык, можа, няма прынцыповай розьніцы паміж тым, што тварылі рымскія ўлады ў XVII ст., і тым, што твораць беларускія ўлады ў XXI ст., руйнуючы ды адбудоўваючы старыя гарадзкія цэнтры?

Але розьніца ёсьць — кардынальная. Рым перабудоўвалі з пачуцьцём стылю. Менск, Горадню ды іншыя беларускія гарады руйнуюць безгустоўна, пахабна, хаатычна і ў той самы час пасьпешліва, нібыта баязьліва ўцягнуўшы галаву ў плечы: «Хутчэй, хутчэй, абы пранесла». Папа Урбан VIII перакройваў Рым так, нібыта зьбіраўся вечна кіраваць Вечным горадам, а беларускія мэры перабудоўваюць гарады так, нібыта яны зьбіраюцца праз год-другі даць лататы ў эміграцыю. Папа Урбан VIII мусіў мець тонкі мастацкі густ, каб заўважыць у Бэрніні ды Бараміні геніяльных архітэктараў і загрузіць іх замовамі. Іх дзейнасьць перакрочыла межы і зьмяніла аблічча Эўропы — каб не яны, хто ведае, ці паўстала б Віленскае барока. А хто там у нас у Мінкульце ці Мінархітэктуры адказвае за «аблічча рэспублікі»? Яўна не Бэрніні з Бараміні. Ці пакінуць які сьлед у гісторыі ўсе гэтыя паркінгі ды шопінгі? Урбан VIII зьмяніў архітэктурны ансамбль Рыму. У нас гарадзкія архітэктурныя ансамблі папросту зьнішчаюць.

«Але Горадня — ня Рым», — скажа нехта. Ну, гэта яшчэ як паглядзець. У любым выпадку, мэр Горадні Антоненка — дакладна ня Папа Урбан.

### Эўропа з эўрарамонтам

Можа скласьціся ўражаньне, нібыта тое, што адбываецца ў Беларусі, ня мае аналягаў у цывілізаванай Эўропе. Але падабенстваў хапае, прычым ня толькі ў мінуўшчыне, а ў сьвежай сучаснасьці — Эўропа і сёньня падае нямала прыкладаў бязглуздых руйнаваньняў ды дрэннага архітэктурнага густу.

Возьмем, напрыклад, Брусэль. З малявдомай сталіцы маленькай краіны ён ператварыўся ў галоўны горад аб’яднанай Эўропы. За гэты падарунак лёсу, аднак, давялося дорага заплаціць. Падчас пабудовы Эўрапейскага кварталу ў Брусэлі руйнавалі цэлыя вуліцы, прымусова адсяляючы жыхароў, забудоўваючы прастору аднастайнымі бэтонна-шклянымі скрынямі. У выніку на плошчы 4 кв. км у цэнтры места паўстала гета для чыноўнікаў, якое пасьля 18.00 ператвараецца ў мёртвы горад. Вуліцы навокал штаб-кватэры Эўракамісіі ўвогуле выглядаюць пэйзажам іншай, непрыдатнай для чалавечага жыцьця, плянэты: бэтон, сталь, люстранае шкло ды дзе-нідзе каржакаватыя дрэўцы-мутанты. Дайшло да таго, што некалькі архітэктараў з розных краінаў стварылі нефармальную групу, якая распрацоўвае альтэрна



WIKIPEDIA.ORG

Касьцёл Sant’Ivo alla Sapienza, паводле праекту Франчэска Бараміні, на месцы сярэднявечных кварталаў.

тыўны плян для Брусэлю, які прадугледжвае знос «каробак» і ператварэньне Эўрапейскага кварталу ў асяродзьдзе, прыязнае да чалавека.

Падобна як і ў Беларусі, на Захадзе ў справу горадабудаўніцтва ўмешваецца бізнэс, які жыве сёньняшнім днём і спадзяваньнем на максымальныя дывідэнты мінімальным коштам. Гэтак, пасьля таго як у Лёндане паўсталі хмарачосы, вельмі многія лёнданцы заўважылі, што гарадзкая лінія далягляду была непапраўна папсаваная. З новага — у Дрэздэне на мінулым тыдні ў багемным раёне Нойштадт (адзіным, які збольшага захаваўся пасьля Другой усясьветнай вайны) моладзь бунтавала супраць разбурэньня старога будынку ды пабудовы на ягоным месцы супэрмаркету. Ды што там Нойштадт — бізнэсоўцы дабраліся і да старой часткі Дрэздэну. Дашчэнту спляжаная бамбардаваньнямі Другой усясьветнай ды ГДРаўскімі ўладамі, яна дагэтуль адбудоўваецца. На свае вочы пару дзён таму бачыў там раскапаныя парэшткі старажытнага фундамэнту. На пытаньне, што тут будзе, прагучаў адказ: офіс кампутарнай фірмы. Мне распавялі, што навабуд ня будзе мець нічога агульнага са старым горадам. Хіба што вокны яго сваёй формай будуць нагадваць вокны Цьвінгеру, шыкоўнага палацавага ансамблю, разьмешчанага па суседзтву.

За прыкладамі сучаснай эўрапейскай архітэктурнай дурасьці далёка хадзіць ня трэба: дастаткова завітаць на кіеўскі Майдан Незалежнасьці, помнік часоў разьвітага «кучмізму». Безгустоўны падземны горад з каскадам шклопакетаў, у цэнтры пляцу — нягеглая клясычная калёна на барочным пастамэнце — карацей, архітэктурны суржык. Неяк давялося пашпацыраваць па ўкраінскай сталіцы з журналістам украінскай «Свабоды» Віталем Панамаровым, знаўцам кіеўскай гісторыі. Ён паскардзіўся: «У Кіеве заўжды былі багатыя людзі. Але чаму раней ім хаця б хапала глузду набываць сабе добрых архітэктараў?» І сапраўды, сваімі густамі нашыя сучасныя мэры ды інвэстары нагадваюць дырэктара калгасу, які прымерваецца, як бы яму танна ды хутка збудаваць для гаспадаркі новы хлеў.

## Традыцыі плюс сучаснасьць

«Старыны ня рушыць». Гэты прынцып — найлепшая гарантыя ад памылак у горадабудаўніцтве. Не руйнаваць таго, што ёсьць. А калі ўжо і трэба нешта паднавіць, то зрабіць гэта з выдумкай ды густам. Вось, спляжылі паравы млын у Горадні. Маўляў, каму трэба тая прамысловая развалюха (якая, аднак, выглядала надта трывалай). Між тым, паводле апошняй эўрапейскай моды, старыя прамысловыя будынкі не руйнуюць, а перарабляюць — ці то пад стылёвыя офісы, ці то пад культурныя цэнтры.

У Лёндане звышпапулярны музэй сучаснага мастацтва Tate Modern месьціцца ў будынку былой ТЭЦ. У Брусэлі агромністыя дэпо былога грузавога вакзалу Gare de Tour et Taxis ператварылі ў выставачныя залі. У Гамбургу інвэстары ажно б'юцца за права скупіць манумэнтальныя склады старога порту, каб перарабіць іх на офісы ды элітныя апартамэнты. Горад пакуль не дае «дабро» гэтым плянам, бо хоча захаваць адмысловы партовы дух. Аднак у раёне докаў ужо будуецца ўльтрасучасная філярмонія, якая мае давершыць ансамбль партовых складоў. У Бэрліне варта завітаць у Kulturbräuerei (раней — бровар), цудоўны культурніцкі комплекс, шалёна папулярны, поўны кавярняў, клюбаў, выставаў ды канцэртаў. Калі ня верыце, спытайцеся ў Лявона Вольскага ды Андрэя Хадановіча — яны там выступалі. У заходненямецкім мястэчку Бохум былая вуглявая шахта Zeche Zollverein ператвораная ў сапраўдны культурны мэгаполіс. На 2010 г. Рурскую вобласьць (у тым ліку Бохум) абралі культурнай сталіцай Эўропы — менавіта дзякуючы таму, што старыя індустрыйныя будынкі былі крэатыўна перароблены ў культурніцкія ўстановы.

Каб беларускія гораданачальнікі былі здольныя, як кажуць немцы, паглядзець цераз край уласнай талеркі, дык зразумелі б, якія магчымасьці яны губляюць, пляжачы свае гарады. Па-першае, плошчы ў аўтэнтычных будынках больш прэстыжныя, чым у навабудах (у Эўропе гэта даўно так, мы да гэтага таксама неўзабаве прыйдзем). Ці возьмем, напрыклад, тую ж эўразьвязаўскую праграму «Культурная сталіца Эўропы». Паводле задумы гэтай праграмы, любы горад можа стварыць канцэпцыю сябе як агульнаэўрапейскай культурнай сталіцы і такім чынам патрапіць на штогадовы конкурс. У выпадку перамогі ён атрымлівае вялікія інвэстыцыі, якія дапамагаюць гэтую праграму зьдзейсьніць. Акрамя гэтага, горад атрымлівае агульнаэўрапейскую «рэклямную» раскрутку як культурная сталіца. Што да гэтага нам, ізаляваным беларусам? Справа ў тым, што ўдзел у праграме (на спэцыяльных умовах) прадугледжаны нават для эўрапейскіх гарадоў па-за межамі ЭЗ. То бок тая ж Горадня пры жаданьні магла б прэтэндаваць на частку з тых мільённых інвэстыцыяў.

Працяг на старонцы 6.



WIKIPEDIA.ORG

Лёнданскія навабуды.

# Мэр для народу ці народ для мэра?

Працяг са старонкі 5.

Дарэчы, летась Кіеў амаль атрымаў тое фінансаваньне, але прайграў у фінале Стамбулу, які зробіцца эўрапейскай культурнай сталіцай у 2010 г. разам з Рурскай вобласьцю і румынскім мястэчкам Печ. Усё праз тое, што Кіеў падкрэсьліваў адно сваю гісторыю, а Стамбул здолеў сумясьціць традыцыі і сучаснасьць.

Што замінала мэру Горадні аддаць гэты няшчасны паравы млын Лёніку Тарасэвічу ці іншым мастакам для творчых экспэрымэнтаў? Паў-Польшчы б у Горадні паперабывала, а то й паў-Эўропы. А мо й на тытул культурнай сталіцы калісьці замахнуліся б...

Усе гэтыя прыклады паказваюць, што мае сэнс (у тым ліку камэрцыйны) зь любоўю выкарыстоўваць тое, што маем. Часьцей за ўсё гэта нашмат прасьцей і эфэктыўней, чым будаваць нешта наноў. «А як быць з панэльнымі хрушчоўкамі?» — спытаецеся вы. Дзіва, але нават тут бываюць выключэньні. Возьмем маленечкае мястэчка Вітэнбэрг ва ўсходняй Нямеччыне. Вучні адной з тамтэйшых школаў, разьмешчаных у стандартным панэльным ГДР-аўскім будынку, неяк напісалі ліст аўстрыйскаму архітэктару-авангардысту Фрыдэнсрайху


АЛЕСЬ КУДРЫЦКІ

**Ня ўсе будынкі маюць каштоўнасьць. Брусэль, 2007.**

Гундэртвасэру з просьбай зрабіць іх школу больш арыгінальнай. Зацікаўлены праектам, ён бясплатна ператварыў школу ў казачны сюррэалістычны палац, адзін з найбольш значных помнікаў сучаснай архітэктуры ў Нямеччыне. Вось вам і бэтонныя дамы! Усё залежыць ад таго, зь якога боку падысьці.

## Эстэтыка як палітыка

Разьмешчаны на сайце nn.by фотарэпартаж Юлі Дарашкевіч з гарадзенскіх вуліц, якія пойдуць пад знос, выклікаў безьліч камэнтароў. Сярод абураных допісаў выбіваецца наступны (пераклад з расейскай): «А па-мойму, дамішкі страшнаватыя, і няўжо так трэба чапляцца за мінулае, можа, хрушчоўкі таксама знасіць ня варта? Шкада, я ніколі ня быў у Горадні, можа, проста на фатаграфіях дамы атрымаліся дрэнна? Але, па-мойму, сьмецьце часам трэба прыбіраць, старое добрае правіла: чым не карыстаесься два гады, тое — сьмецьце». Так думаюць вельмі і вельмі многія. А можа, тут няма правых ды вінаватых? Што калі тут проста розьніца ў густах? Магчыма, мы пакеплівем з Нацыянальнай бібліятэкі так сама, як некалі французы — з Эйфэлевай вежы? Можа, і сапраўды беларускія гарады не руйнуюцца, а «прыгажэюць з кожным днём»?

Думаецца, рацыя ўсё-такі на нашым баку, а не на баку «прагматыкаў». Уладзе можна дараваць памылкі ды экстравагантныя паводзіны тады, калі яна робіць іх, ствараючы якасны культурны кантэкст. Але калі ўлада стварае кантэкст, які спрэс складаецца з памылак, гэтаму трэба супраціўляцца. Звонку «пірамідзішча», якую зьбіраюцца будаваць у старым цэнтры Віцебску, нечым нагадвае шкляную піраміду ў парыскім Люўры. Адчуваецца, што беларускія архітэктары ўважліва вывучаюць замежныя паштоўкі. Праўда, не пашкодзіла б насамрэч завітаць у Люўр, тады архітэктары маглі б заўважыць, чаму Франсуа Мітэран дазволіў сабе гэтую маленькую архітэктурную вольнасьць, якая, дарэчы, выклікала ў свой час даволі шмат крытыкі ў Францыі. Шкляная піраміда, якую на замову Франсуа Мітэрана стварыў архітэктар Мінг Пэй, зрабілася фінальнай кропкай у амбітным праекце — ператварэньні Люўру ў самы вялікі музэй сьвету (ягоная плошча была пашыраная ў два разы, з 30 тыс. да 60 тыс. кв. м). Дасягнуўшы гэтага, Франсуа Мітэран выканаў мару Людовіка




**Музэй Tate Modern месьціцца ў будынку былой ЦЭЦ.**

WIKIPEDIA.ORG



**Піраміда каля Люўру.**



PERSO.ORANGE.FR

**Макет забудовы каля «Сіняга дому» ў цэнтры Віцебску.**

XIV, і таму заслужыў, каб ягонае імя было зьвязанае зь Люўрам. Фігуральна кажучы, калі вы будуеце шкляную піраміду, то пабудуйце і Люўр. Ці, прынамсі, адбудуйце Мікалаеўскі сабор. Недарэчнасьці робяцца цікавымі акцэнтамі, калі яны дапаўняюць бясспрэчныя шэдэўры, а не тады, калі яны застаюцца «недарэчнасьцю ў сабе». Радзімка на твары Мэрылін Манро робіць яго непаўторным. Радзімка бяз твару Мэрылін Манро — недарэчнасьць. Замест таго каб ствараць твар краіны, беларускія ўлады прапануюць нам у якасьці горадабудаўнічай палітыкі гідкі камяк, які складаецца з такіх вось радзімак.

Нехта лічыць, што гарадзенскія камяніцы непаўторныя, іншы — што яны непрыгожыя. Кожны мае права на свой уласны густ. Але, падабаюцца каму ці не, яны складаюць непаўторную архітэктурную палітру, як той Парыж, дзе «дамы зыродлівыя, але іх ансамбль цудоўны». Руйнуючы старыя дамкі, улады разбураюць характар, душу нашых гарадоў.

Нават асобны будынак ці фрагмэнт банальнай вуліцы можа захоўваць дух цэлай краіны. Гадоў дзесяць таму ў Філядэльфіі, адным з найстарэйшых амэрыканскіх гарадоў, мне, нібы найкаштоўнейшы дыямэнт, паказалі караценькую вулку. Навокал хмарачосы, а тут — малюпасенькія дамкі, адзіныя, якія захаваліся з тых часоў, калі яшчэ ня высах атрамант на Дэклярацыі незалежнасьці ЗША. Так сама ашчадна захоўваюцца і старыя будынкі на высьпе Эліс, у Нью-Ёрку, праз якую праходзілі ўсе эмігранты, якія хацелі трапіць у Новы Сьвет. Менавіта тут, а не сярод хмарачосаў, адчуваеш сапраўдны дух гэтай краіны.

Калі ў спрэчках з прагматыкамі не спрацоўваюць эстэтычныя аргумэнты, застаецца зьвярнуцца да апошняга, які, бадай, насамрэч зьяўляецца самым важным — руйнуючы гарады, улада пагарджае намі, людзьмі. Можна бясконца спрачацца, чый Менск больш прыўкрасны ды густоўны — Сяргея Харэўскага ці мэра Паўлава. Але бясспрэчна тое, што галоўнае слова тут павінна быць за Сяргеем Харэўскім (то бок за кожным паспалітым менчуком і, увогуле, за кожным беларусам), а не за мэрам, ці нейкім бязтварым інвэстарам, ці архітэктарам-праджэкцёрам. Улада ня мае права вырашаць за нас, якімі быць нашым гарадам. Вырашаць павінны людзі, найперш праз магчымасьць самім выбіраць мэра, мясцовую ды цэнтральную ўладу і рэальна ўплываць на іх учынкі.

Раз-пораз даводзіцца чуць думку, што змаганьне за нашы гарады — тое, што можа аб’яднаць людзей, ня ўцягваючы іх у палітыку. Не пагаджуся. Змаганьне за гарады — гэта і ёсьць жывая палітыка, змаганьне за права людзьмі звацца, спроба прымусіць уладу слухаць і слухацца нас. Цалкам пераводзячы змаганьне за гарады ў эстэтычную плоскасьць, мы рызыкуем застацца ў меншасьці. Гэта — не праблема густаў. Гэта — праблема дачыненьняў улады і народа: хто для каго?




**Горадня. Пратэсты супраць разбурэньня гістарычных кварталаў.**

# Рэканструкцыя «Эўропы»

Ня ў прыклад менскім рэстаўрацыям, у Наваградку па ўсіх правілах аднаўляецца гатэль «Эўропа». Праўда, гарадзкія ўлады закамандавалі фірме—будаўніку аднавіць за свой кошт яшчэ паўвуліцы. Піша Сямён Печанко.

У жніўні 2006 г. менскае навукова-вытворчае аб'яднаньне «Эльвіра» выкупіла ў наваградзкага прадпрымальніка Ўладзімера Максімчыка будынак №3 па вул.Замкавай. Трохпавярховая камяніца XVIII ст., былы гатэль «Эўропа», знаходзілася ў аварыйным стане. Кіруючыся высновамі экспэртаў, новы ўласьнік пастанавіў дэмантаваць будынак, каб пасьля аднавіць у колішнім выглядзе.



**Так выглядаў будынак былога гатэлю «Эўропа» ў Наваградку.**

## Гарадзкі квартал з камунікацыямі ў нагрузку

Адказным за рэканструкцыю прызначаны дырэктар «Эльвіры» Аляксандар Поткін, ураджэнец Наваградку. Паводле яго словаў, былы ўласьнік самавольна ажыцьцявіў перабудову унутраных канструкцыяў камяніцы: будынак меў разбураныя перакрыцьці, разабраную падлогу на другім паверсе, паздыманыя бэлькі, што надавалі жорсткасьць канструкцыі. Паўночную сьцяну выперла вонкі і яна пагражала абрынуцца. У пограбе адсутнічала пячное ацяпленьне, неабходнае для рэгулярнага прасушваньня падмуркаў. Экспэрты кампаніі «Інтэбудпраект» рэкамэндавалі разабраць будынак. Перад гэтым былі зробленыя ўсе неабходныя замеры, геалягічнае дасьледаваньне грунту, пачаліся археалягічныя раскопкі ля падмуркаў. Усё гэта патрабавала дазволу і зацьвярджэньня ў гарвыканкаме.

А.Поткін кажа, што ўлады не перашкаджаюць працы яго фірмы, ідуць насустрач. Аднак ад «Эльвіры» чакаюць хутчэйшага завяршэньня працы, а гэта немагчыма па некалькіх прычынах. Па-першае, рэканструкцыя патрабуе грунтоўных археалягічных дасьледаваньняў, па-другое, у часе ўзгадненьня ахоўнай зоны фірме прапанавалі адбудаваць яшчэ два аб'екты на вул.Замкавай — каб аднавіць участак гарадзкога ансамблю ў першапачатковым выглядзе. Каб падвесьці да будучага гатэлю неабходныя камунікацыі, фірме спатрэбіцца працягнуць газа- і водаправод на ўчастку прылягаючай вуліцы.

«Шмат часу і рэсурсаў адбірае і папяровая праца» — кажа сп.Поткін, паказваючы на паліцу, шчыльна застаўленую тэчкамі з дакумэнтамі. Часам, каб узгадніць, той ці іншы дакумэнт, даводзіцца ехаць ня толькі ў Наваградак, але і ў Ліду, і Горадню.

## Знаходкі археоляга Собаля

Валянцін Собаль займаўся дасьледаваньнем падмуркаў наваградзкіх камяніц — былога гатэлю і суседняга, разбуранага ў часе вайны будынку, прапанаванага да аднаўленьня. У шурфах на глыбіні 2,2—2,4 м адшуканыя рэчы тысячагадовай даўніны, напрыклад, шкляныя бранзалеты XII ст. «Тут, на адлегласьці паўкілямэтра ад замку, знаходзіліся пасадзкія паселішчы, нашмат старэйшыя за тую забудову, што цяпер плянуецца аднавіць. Пра гэта сьведчаць знойдзеныя парэшткі хатніх жывёлаў, аскепкі посуду», — распавядае В.Собаль. Ён адшукаў і рэшткі хаты XVI ст. з фрагмэтамі печы: «Кафля гербавая, быў бы час, можна было б даведацца, хто быў гаспадаром хаты». Археоляг лічыць, што на дасьледаваньні трэба больш часу. Усё залежыць ад цяперашніх гаспадароў — ці знойдуць яны грошы на гэта. У ідэале В.Собаль бачыць тут музэйную экспазыцыю, што магло б прыцягнуць яшчэ больш турыстаў.

## За і супраць

Дырэктар «Эльвіры» А.Поткін лічыць, што ад рэканструкцыі будынку выйграюць усе — горад атрымае аднаўлены квартал ды трохзоркавы гатэль. Ён пэўны, што яго фірма выконвае ўсе патрабаваньні закону аб ахове гістарычнай спадчыны. В.Собаль мае адзіную прэтэнзію да рэстаўратараў: разабралі падмуркі, якія можна было яшчэ ўмацаваць. У астатнім, кажа ён, усё магчымае было зроблена: «У часе дэмантажу былі зробленыя неабходныя замеры, частку найбольш трывалай цэглы, камінную і пячную кафлю, драўляную лесьвіцу, аконныя рамы захавалі, каб потым выкарыстаць ізноў». Галоўнае, лічыць сп.Собаль, нельга падганяць рэс-

таўратараў: «У нас жа часта бывае так — аблвыканкам вылучае сродкі і потым кантралюе, каб яны былі засвоеныя строга па графіку, не зважаючы на важнасьць гістарычнага аб’екту».

Новага гатэлю ў Навагрáдку чакаюць супрацоўнікі адзінай тут турфірмы. На іх думку, мясцовы гатэль не адпавядае патрабаваньням замежнікаў. З гэтым нязгодная юрыст Вольга Кастрамінава, якая таксама паходзіць з Навагрáдку: «Навошта перабудоўваць гістарычны будынак, калі пяціпавярховы гатэль амаль заўсёды пусты». На думку Вольгі, будынак быў менавіта зьнесены, і для гэтага не было пільных прычынаў. Яна зьвярталася ў раённую ды абласную пракуратуры, але атрымала адказ пра законныя дзеяньні «Эльвіры». У адказе з раённай пракуратуры, у прыватнасьці, гаворыцца, што дазвол Мінкульту на правядзеньне супрацьаварыйных працаў быў выдадзены НВА «Эльвіра» ў сувязі з «узьніклай на аб’екце аварыйнай сытуацыяй для прадухіленьня далейшага разбурэньня будынку», а дэмантаж дахоўкі і аварыйных сьценаў адбываўся ў адпаведнасьці з нарматыўна-тэхнічнай дакумэнтацыяй.



СЯМЁН ПЕЧАНКО

**Падмуркі «Эўропы». Будыначак справа — навагрáдзкая «пізанская вежа». Адхіленьне яго сьценаў складае 20 см. Уласьнікі такім і хочуць яго захаваць.**

Навагрáдзкая гісторыя пакідае шэраг пытаньняў. Чаму будынак былога гатэлю быў даведзены да аварыйнага стану і ці пакараны вінаваты ў гэтым прадпрымальнік? У Навагрáдку гэта ня першая такая гісторыя: у 1999 г. мясцовы мэцэнат Пятро Сільвановіч узяўся аднавіць вятрак на Малой замкавай гары — былую надбрамную вежу. Скончылася сумна: вежа, якую памылі пажарныя машыны, развалілася. Прадпрымальніка не пакаралі.

Уладзімера Максімчыка двойчы выклікалі ў райвыканкам і загадвалі пачаць супрацьаварыйныя працы. Галоўны спэцыяліст аддзелу культуры Навагрáдзкага райвыканкаму Вячаслаў Лаўрышчук мяркуе, што Максімчык вінаваты часткова: «Будынак быў і да яго аварыйны, час над ім папрацаваў». Але пытаньне, навошта было разьбіраць унутраныя перакрыцьці, застаецца без адказу.

«Мы зьвяртаем увагу на вялікія гарады, тым часам спадчына нашых мястэчак і невялікіх гарадоў незаўважна гібее, а месцамі яна ня менш вартая, чым віцебская ці менская», — мяркуе гарадзенскі гісторык Янка Лялевіч. На яго думку, навагрáдзкі досьвед, у выпадку, калі падчас адбудовы сапраўды будуць ужытыя аўтэнтычныя кампанэнты ды захаваюцца ўсе парамэтры былога будынку, а таксама выкарыстаюць напоўніцу археалягічныя досьледы, будзе прыкладам для астатніх.



**Макет забудовы. У цэнтры — адноўлены гатэль, зьлева і справа — будынкі, якія фірма мусіць аднавіць «у нагрузку».**

# Горадня, якой хутка ня будзе



Сацыялістычная, 44.




Урыцкага, 12.



Урыцкага, 15.

# Мілінкевіч сустрэўся з Бушам

Лідэр дэмакратычных сіл Беларусі сумесна з прэзыдэнтамі шэрагу краін і вядомымі дзеячамі 5—6 чэрвеня браў удзел у міжнароднай канфэрэнцыі «Дэмакратыя і бясьпека».

Акрамя ўдзелу ў форуме, Аляксандар Мілінкевіч меў двухбаковыя сустрэчы з прэзыдэнтам ЗША Джорджам Бушам, прэзыдэнтам Эстоніі Томасам Хенрыкам Ільвэсам, экс-прэзыдэнтам Чэхіі Вацлавам Гаўлам, міністрам замежных спраў Чэхіі Карэлам Шварцэнбэргам, кіраўніком Інстытуту палітычных дасьледаваньняў пры Шалом Цэнтры (Ізраіль) Натанам Шчаранскім, прэзыдэнтам радыё «Свабода» Джэфры Гедмінам.

Міжнародная канфэрэнцыя «Дэмакратыя і бясьпека» праводзіцца напярэдадні саміту «Вялікай васьмёркі» і прысьвечана сытуацыі ў краінах з аўтарытарнымі і таталітарнымі рэжымамі.

«Толькі павага да правоў чалавека забясьпечвае бясьпеку і стабільнасьць. Тыя краіны, якія не паважаюць правы сваіх грамадзян, не будуць паважаць правы іншых народаў», — заявіў Мілінкевіч напярэдадні візыту.

Візыт Мілінкевіча адбываецца на запрашэньне экс-прэзыдэнта Чэхіі Вацлава Гаўла.

**МБ**

**Лукашэнка ў Полацку, на асьвячэньні ракі сьвятой Эўфрасіньні**

**Кіраўнік дзяржавы ўзяў удзел ва ўрачыстасьцях асьвячэньня адноўленай ракі прападобнай Эўфрасіньні Полацкай. 5 чэрвеня ён таксама азнаёміўся з Полацкам і ягоным гісторыка-культурным музеем-запаведнікам.**

# 64% беларусаў хацелі б беларускамоўнага прэзыдэнта

29,7% рэспандэнтаў, апытаных Незалежным інстытутам сацыяльна-эканамічных і палітычных дасьледаваньняў (Літва), лічаць, што кіраўнік Беларусі мусіць па тэлевізіі ці радыё заўсёды выступаць па-беларуску. 34,1% мяркуе, што ён павінен гэта рабіць час ад часу (выступаючы пры пэўных урачыстых нагодах і г.д.), яшчэ 34,3% апытаных ня лічаць ужываньне беларускай мовы абавязковым.

З дасьледаваньня цэнтру прафэсара Манаева вынікае, што грамадзяне краіны падзеленыя ў сваіх моўных прыхільнасьцях на тры прыкладна роўныя групы. Адны выступаюць за тое, каб у публічнай палітыцы выкарыстоўвалася найперш беларуская мова, другія хацелі б, прынамсі, выразнай прысутнасьці роднай мовы, трэцяя стаўіцца да моўнае праблемы абыякава.

Тым часам дзейны прэзыдэнт краіны не гаворыць па-беларуску. Няма ніводнага беларускамоўнага і сярод дзейных міністраў і дэпутатаў.

**Мікола Бугай**




WWW.CHARTER.ORG

# Студэнты насілі па сталіцы труну

Увечары ў пятніцу на Нямізе некалькі дзясяткаў навучэнцаў вынесьлі сымбалічную труну з надпісам: «Ільготы». Наперадзе пахавальнае працэсіі несьлі вялікі льготны талёнчык у чорнай рамцы.

Міліцыянты разагналі акцыю. Пяць чалавек затрымана. Яны пазьней былі асуджаныя да арышту на некалькі сутак.

Акцыя пратэсту супраць адмены льготаў адбылася таксама ў Магілёве. У ёй узялі ўдзел актывісты Саюзу левых сілаў і АГП. Таксама ёсьць затрыманьні, паведамляе радыё «Свабода».

**МБ**

# Жыхар Крупскага раёну, які задушыў голымі рукамі бабра, забіў чалавека

Звычайная п'янка ў вёсцы Ўхвала (Крупскі раён Менскай вобласьці) скончылася забойствам.

48-гадовы беспрацоўны вясковец прыраўнаваў сужыцельку да гаспадара кватэры, дзе праходзіла бяседа.

Мужчына дастаў прыхаваны штых ад вінтоўкі часоў другой усясьветнай вайны, закалоў субутэльніка і двойчы параніў кабету. Цяпер забойца ў сьледчым ізалятары, у дачыненьні да яго распачалі крымінальную справу паводле артыкулу 139 КК.

Раней гэты самы чалавек шакаваў людзей, голымі рукамі задушыўшы бабра. На яго таксама завялі крымінальную справу, але абмежаваліся штрафам. Перад тым мужчына сядзеў за кратамі за рабаваньне крамы.

**Зьміцер Панкавец**

# У Латвіі прэзыдэнт — доктар

Латвійскі Сойм абраў новым прэзыдэнтам краіны 52-гадовага доктара-артапэда Валдыса Затлерса. Затлерс — беспартыйны, які ніколі раней не займаў палітычных пасадаў.

У Латвіі на прэзыдэнта звычайна абіраюць паважаных асобаў, здольных зьяднаць нацыю.

Паўнамоцтвы цяперашняй прэзыдэнткі, эколяга Вайры Віке-Фрэйбергі завяршаюцца 7 чэрвеня. У Латвіі прэзыдэнт ня можа быць на пасадзе даўжэй за 8 гадоў.

Перад абраньнем Затлерс прызнаў, што браў ад пацыентаў грошы і падарункі, але не дэкляраваў іх як даходы. Аднак Бюро па барацьбе з карупцыяй прызнала, што гэта нязначнае парушэньне.

**МБ**



## У Латвіі заробкі ў 2,5 раза вышэйшыя, чым у Беларусі

Сярэдні заробак у першым квартале 2007 г. у Латвіі склаў 357 латаў, альбо 682 даляры па курсе. Гэта на 32,8% больш, чым у першым квартале 2006 г., паведамляюць латвійскія СМІ.

Пры гэтым у грамадзкім сэктары ён павялічыўся з 301 лату ў 2006 г. да 406 латаў у 2007 г. (з $575,5 да $776), а ў прыватным сэктары з 252 да 334 латаў (з $482 да $639).

Найменшыя заробкі ў Латгаліі (гэта на мяжы з РБ) — 249 латаў ($476).

Сярэдні заробак у Літве па выніках першага кварталу складае 517 даляраў чыстымі (1329 літаў), у Эстоніі — 550 даляраў.

Паводле Міністэрства статыстыкі і аналізу Беларусі, сярэдні налічаны заробак у першым квартале склаў $287.

## СЬЦІСЛА

### Ствараецца партыя ўлады

19 мая рэктар Гарадзенскага дзяржаўнага аграрнага ўнівэрсытэту і дэпутат савету рэспублікі Вітольд Песьціс на канцэрце «За квітнеючую Беларусь» у Горадні выступіў зь ініцыятывай стварэньня па ўсёй краіне пярвічных арганізацыяў грамадзкага аб’яднаньня «Белая Русь». І зараз жа арганізацыі «БР» пачалі ўтварацца ва ўсёй краіне. Установучыя сходы прайшлі ў Воршы, Бешанковічах, Барысаве, Крупках, Гарадку, Гомелі. Гэта суправаджаецца інфармацыйнай падтрымкай. Практычна па тым самым сцэнары некалі ствараўся БРСМ. Выглядае, цяпер улады вырашылі стварыць агульнарэспубліканскую арганізацыю і для больш сталых грамадзянаў.

**Зьміцер Панкавец**

### Зь Чыжа ўзялі падпіску пра нявыезд

Крыніцы «Белорусского партизана» ў Генпракуратуры паведамілі, што з прадпрымальніка Юр’я Чыжа ўзятая падпіска пра нявыезд. Сьледчыя матывавалі гэта неабходнасьцю правядзеньня актыўных сьледчых дзеяньняў. Юры Чыж — адзін з найбагацейшых бізнэсоўцаў краіны, уласьнік многіх прадпрыемстваў, сярод якіх «Трайпл» і футбольны клюб «Дынама».



### Пачаўся другі набор на праграму Каліноўскага

У новым навучальным годзе Камітэт абароны рэпрэсаваных «Салідарнасьць» працягне дапамагаць беларускім студэнтам, якія пацярпелі за грамадзкую актыўнасьць. Пры патрэбе звыш ста чалавек змогуць распачаць навучаньне ў розных ВНУ Эўропы, дзякуючы падтрымцы ўрадаў Польшчы, Украіны, Чэхіі, Літвы, Аўстрыі.

Праўда, у гэтым годзе праграма будзе распаўсюджвацца толькі на тых навучэнцаў, якія былі выключаныя.

### Фэдэрацыя прафсаюзаў падрабіла подпісы

На сайце ФПБ разьмешчана інфармацыя пра міжнародную падтрымку беларускіх афіцыйных прафсаюзаў у сувязі з магчымым пазбаўленьнем Беларусі гандлёвых прэфэрэнцый. Міжнароднае аб’яднаньне прафсаюзаў мэталістаў (МАП) заявіла, што подпісы яго чальцоў пад зваротам у падтрымку ФПБ сфальшаваныя. Пра гэта паведаміў старшыня гэтай арганізацыі Мікалай Шатохін. На думку старшыні Фэдэрацыі незалежных прафсаюзаў Расеі Міхаіла Шмакава, выдаленьне Беларусі зь ліку карыстальнікаў Абагуленай сыстэмы тарыфных прэфэрэнцыяў Эўразьвязу стала вынікам «непрыхаванага нежаданьня ўраду Беларусі выконваць Канвэнцыі Міжнароднай арганізацыі працы».

### Ідзе вайна з «талеркамі»

Зьняць прыватныя спадарожнікавыя антэны патрабуюць ад жыхароў Пінску. Абвесткі з адпаведным загадам зьявіліся на пад’ездах.

### Новыя Курапаты?

Пад Гомелем, у лясным масіве, на тэрыторыі Прыбыткоўскага сельсавету, салдаты 52-га спэцбатальёну вядуць раскопкі на месцы масавага пахаваньня. Інфармацыя аб ім прайшла ад мясцовых жыхароў. Іх маглі расстраляць ці нацысты, ці саветы ў 1939-40-я.

### Штодня ў інтэрнэт выходзяць толькі 5% беларусаў

58,3% насельніцтва інтэрнэтам не карыстаюцца. Такі вынік дало дасьледаваньне НІСЭПД.

**АГ, МБ, АК**

# Дайшла чарга да МАЗу

Распачалася падрыхтоўка да прыватызацыі найбуйнейшага машынабудаўнічага прадпрыемства краіны.

Праўда, Міністэрства прамысловасьці супраціўляецца. Аднак Дзяржкамітэт па маёмасьці лічыць пляны акцыянаваньня прадпрыемства мэтазгоднымі. Апошняе слова застаецца за прэзыдэнтам.

Экспэрты мяркуюць, што прыватызацыя Менскага аўтазаводу не адбудзецца ў бліжэйшай пэрспэктыве. Цяпер у полі ўвагі знаходзяцца прадпрыемствы, што немінуча сутыкнуцца з эканамічнымі праблемамі ў выпадку страты дзяржпадтрымкі. Важнейшай умовай хуткай прыватызацыі ёсьць таксама наяўнасьць зацікаўленага інвэстара.

Іншае менскае прадпрыемства, «Мотавэла», чакае інвэстара.

Тут становішча даўно ўжо ня мёд. Рэнтабэльнасьць складае мінус 10%. З пачатку году вырабілі ўсяго 115 мапэдаў. Людзі працуюць няпоўны тыдзень. Цяпер на акцыі прадпрыемства прэтэндуюць два інвэстары — беларускі «Амкадор» і расейская фірма, назва якой пакуль трымаецца ў сакрэце.

Нагадаем, што згодна з указам прэзыдэнта ад 30 сьнежня 2005 г. ААТ «Мотавэла» было вернутае дзяржаве за запазычанасьці. Пасьля іх поўнага пагашэньня доля дзяржавы ў статутным фондзе прадпрыемства складзе 99,9%.

**Сямён Печанко**

# Уладальнікам чэкаў «Маёмасьць» далі тры гады

Урад настойвае наануляваньні нявыкарыстаных цягам трох год сэртыфікатаў бяз выплаты кампэнсацыі.

7 чэрвеня парлямэнт вырашыць далейшы лёс прыватызацыйных чэкаў.

Чэкавая прыватызацыя распачалася ў 1994 годзе. З таго часу тэрмін дзеяньня чэкаў працягваўся пяць разоў. Гэтым разам дзеяньне чэкаў «Маёмасьць» плянуецца падоўжыць яшчэ да 31 сьнежня 2009 г.

На канчатковую грашовую кампэнсацыю ўласьнікам нявыкарыстаных сэртыфікатаў папросту няма сродкаў у бюджэце. Выкуп такіх чэкаў патрабуе 821 млрд. рублёў.

Каб заахвоціць уладальнікаў нявыкарыстаных чэкаў, урад зьбіраецца пашырыць сьпіс акцыянэрных таварыстваў, акцыі якіх можна будзе памяняць на прыватызацыйныя чэкі. У гэты пералік патрапяць каля 30 прадпрыемстваў, што плянуюць прыватызаваць сёлета.

Варта нагадаць, што ў красавіку парлямэнцкая камісія вярнула на дапрацоўку ва ўрад законапраект, прапанаваны Міністэрствам эканомікі, які прадугледжваў ануляваньне нявыкарыстаных чэкаў без кампэнсацыі. Шэраг парлямэнтароў зьвярнулі ўвагу на парушэньне канстытуцыйных правоў уласьнікаў нявыкарыстаных чэкаў. Не зважаючы на гэта, урад усё ж настаяў на сваім, каб паставіць на разгляд парлямэнту пытаньне чэкавай прыватызацыі.

**СП**

# «Газпром» заплаціў першыя грошы за «Белтрансгаз»

«Газпром» выплаціў Беларусі першыя 625 млн даляраў, выкупіўшы 12,5% акцый ААТ «Белтрансгаз».

Дамова аб куплі-продажы была падпісаная 18 траўня. Згодна зь ёй, Расея мусіла выплаціць суму за найбліжэйшыя 20 працоўных дзён. Грошы «Газпром» пералічыў датэрмінова.

Зараз за 10-дзённы тэрмін беларускі бок перавядзе 12,5% акцый на імя «Газпрому». Далей цягам 50 дзён пройдзе сход акцыянэраў, на якім у склад рады СП будзе ўведзены прадстаўнік «Газпрому».

Усяго А.Лукашэнка паабяцаў расейскай кампаніі 50% акцый ААТ «Белтрансгаз». Паводле дамоўленасьці, выплата за іх будзе адбывацца паэтапна на працягу трох гадоў.

Усяго «Белтрансгаз» быў ацэнены на 5 млрд даляраў ЗША. Штогод «Газпром» будзе набываць 12,5% акцый кампаніі.

**СП**

### Сальда мінус мільярд

У Беларусі ў студзені-красавіку сальда замежнага гандлю склалася адмоўным у памеры $1163 млн, паведаміў Мінстат.

Экспарт у Расею вырас на 27% і склаў $2463 млн. Экспарт у краіны па-за СНД зьнізіўся на 2% і склаў $3463 млн. У прыватнасьці, экспарт у Нямеччыну зьнізіўся на 44% і склаў $147 млн.

У агульным аб’ёме імпарту пастаўкі з СНД павялічыліся на 14% і склалі $4966 млн. У тым ліку, аб’ём імпарту з Расеі павялічыўся на 12% і склаў $4466 млн. З краін па-за СНД Беларусь павялічыла імпарт на 38% да 2775 млн.

**АФН**

### Амэрыканцы прапануюць выпуск рухавікоў на базе Маторнага заводу

Амэрыканская International Truck and Engine мае намер рэалізаваць у Беларусі супольны праект па стварэньні рухавікоў з удзелам Менскага маторнага заводу. Пра гэта паведамілі на сумесным прадпрыемстве «Вэстэрн Тэхнолоджыз» у Менску.

Гэта найбуйнейшая ў сьвеце кампанія па вытворчасьці дызэльных грузавікоў маркі «Дэтройт Дызэль» ужо 10 гадоў пастаўляе ў Беларусь маторы. За гэты час выраблена больш за 4 тыс. трактароў МТЗ і камбайнаў «Гомсельмаш» на базе рухавікоў «ІТЭ».

Цяпер у Беларусі ёсьць і іншыя буйныя спажыўцы дызэльных рухавікоў — БелАЗ, МАЗ, «Амкадор». Апроч паставак агрэгатаў у Беларусь кампанія прапануе сумесную вытворчасьць на базе Маторнага заводу.

Гэтыя прапановы абмяркоўваліся ў сераду на сустрэчы дэлегацыі амэрыканскай карпарацыі з кіраўніцтвам Мінпраму. На МТЗ, апроч гэтага, плануецца абмеркаваць стварэньне сумеснай зборкі гусенічных трактароў.

**МБ**

# Сустрэча G8 — што новага

У сераду ў нямецкім мястэчку Гайлігендам распачалася сустрэча лідэраў краінаў «Вялікай Восемкі» («G8»). Галоўная інтрыга саміту — ці ўдасца Ангеле Мэркель пераканаць Джорджа Буша змагацца супраць кліматычных зьменаў разам з астатнім сьветам. Беларусам жа цікава будзе назіраць за тым, як будзе паводзіць сябе Пуцін. І як будуць паводзіць сябе з Пуціным.

## Лідэры за дротам

Ангела Мэркель спадзяецца, што сустрэча ў Гайлігендаме зробіцца знакам барацьбы за выратаваньне сусьвету ад экалягічнай катастрофы. Аднак пакуль што адзіны вобраз, які стала зьвязваецца зь сёлетняй сустрэчай — мур з дроту, за якім зьбіраюцца лідэры дзяржаваў-волатаў. Па іншы бок муру — дэманстранты, якія жорстка б'юцца з паліцыяй. У сутычках ужо пацярпелі больш за 1000 чалавек. Размаўляючы ў Нямеччыне зь людзьмі з асяродку антыглябалістаў ды ўсялякага кшталту левых рухаў, дзівісься, наколькі яны злая на сваю паліцыю. Як тыя беларусы на АМОН. І сапраўды, гумовымі дручкамі нямецкія спэцназаўцы працуюць так сама энэргічна, як і нашыя. Праўда, пры больш пільным назіраньні, заўважныя адрозьненьні. Пакуль справа не даходзіць да сутычак, нямецкія паліцыянты — надзвычай цярплівыя ды ветлівыя, рахмана зносяць такія кпіны, за якія ў Беларусі ўжо даўно паклалі б тварам на асфальт. А што да дэманстрантаў, то тут нямецкім паліцыянтам не пашанцавала: у адрозьненьне ад Беларусі, закідваньне паліцыі камянямі на Захадзе — хутчэй правіла, чым выключэньне.

Разам з тым, у стане антыглябалістаў вымалёўваецца канфлікт. Сур'ёзная, рацыянальная частка руху ўсё больш схільная ад эмоцыяў пераходзіць да аналізу і канкрэтных прапановаў па паляпшэньні сытуацыі ў глябалізаваным сьвеце. Радыкальная частка, наадварот, усё больш схіляецца да банальнай агрэсіі, чым моцна замінае першай. Вось чаму антыглябалісцкая арганізацыя Attac, якая пакрысе высьпявае на салідную палітычную сілу, афіцыйна папрасіла прабачэньня за сутычкі.

Кадры сутычак у Нямеччыне, варта меркаваць, зробяцца хрэстаматыйнымі для беларускіх прапагандысцкіх перадачаў пра «іх норавы». Вось вам, маўляў, заходняя дэмакратыя!

## Афрыка ды клімат

З набалелых сусьветных праблемаў на саміце будуць абмяркоўваць змаганьне са зьменамі клімату ды афрыканскія праблемы. Што да клімату, дык інтрыга ў тым, каб вызначыць, што будзе пасьля скончэньня дзеяньня Кіёцкага пратаколу. Ці здолеюць індустрыйныя гіганты выпрацаваць адзіную экалягічную палітыку? Ці наадварот — будуць змагацца за зьмяншэньне выкідаў у атмасфэру паасобку?

Хранічныя праблемы Афрыкі, як заўжды, не даюць спакою вялікім краінам. Ці трэба даравацъ афрыканскім краінам іх запазычанасьць? Ці трэба ўвогуле дапамагаць Афрыцы, і як? Прынамсі, фігуруе лічба дапамогі ў 50 млрд даляраў да 2010 г. Пытаньне ў тым, наколькі эфэктыўна тая дапамога будзе выкарыстоўвацца — пакуль што яна спрыяе ў тым ліку і карупцыі ды ўтрыманскім настроям сярод афрыканскіх урадаў, не даючы выразнага плёну (ад 60-х гадоў у Афрыку ўжо накіравалі 500 млрд. даляраў).

> З узмацненьнем канфлікту Захаду з Расеяй Беларусь робіцца аб'ектам барацьбы.

## Прэтэнзіі Расеі

Словазлучэньне «Вялікая сямёрка» ўжоператварылася ў гістарызм. Але ж зусім нядаўна — у 90-я — Расею запрасілі да ўдзелу ў «вялікай сямёрцы» ўсяго толькі ў якасьці назіральніцы. Гэта была своеасаблівая палітычная даніна павагі, калі не сказаць міласьціна эксупэрдзяржаве. А таксама своеасаблівая мера перасьцярогі — СССР зьнік, але Расея захавала патэнцыял да стварэньня канфлікту з краінамі-прадстаўніцамі «залатога мільярду».

І што адбылося? «Сямерка» ня толькі ператварылася ў «восемку», а ўжо Пуцін летась прымаў гасьцей у сваёй радзіме ў Санкт-Пецярбургу, усяляк прэзэнтуючы Расею як аднаўленую супэрдзяржаву. Мера перасьцярогі не спрацавала — РФ трывала атабарылася ў «восемцы», у той самы час як яе канфліктны патэнцыял працягвае імкліва расьці.

«Халодная вайна скончаная», — заявіў Буш, выступаючы ў Празе напярэдадні саміту. Так амэрыканскі прэзыдэнт адрэагаваў на абурэньне Расеі разбудовай сыстэмы проціракетнай абароны. Маўляў, Крамлю няма чаго баяцца — сыстэма не накіраваная супраць Расеі. «Чаму б вам не паўдзельнічаць у ёй разам з ЗША?» — спытаўся Буш. Пуцін трымаецца адваротнай думкі. У інтэрвію, якое ён даў журналістам краінаў «G8» ў панядзелак, ён кажа менавіта пра «халодную вайну»: «Мы, натуральна, вяртаемся да гэтых часоў». І прыгразіў перанакіраваць ракеты на Эўропу.

Пуцін усяляк жанглюе касаўскай праблемай ды стварае мэдыяскандалы вакол пабудовы амэрыканскай сыстэмы ПРА. Ён з усяе сілы правакуе Захад на рэзкія крокі. Выглядае, што перад прэзыдэнцкімі выбарамі-2008, Крэмль зноў абвесьціць Захад галоўным ворагам. Мо мэта гэтага — апраўдаць будучыя парушэньні на выбарах, з дапамогай якіх будзе гарантаваная перамога «пераемніка»? Калі Пуцін прыйшоў да ўлады на хвалі боязі ўнутранага ворага (чачэнскія тэрарысты), то гэтым выбарцам прапануюць новы аб'ект страху і нянавісьці.



# для сьвету і для Беларусі?

Пуцін самапрэзэнтуецца на саміце як «апошні дэмакрат» пасьля Махатмы Гандзі, якому і «паразмаўляць няма з кім». Гучыць ня толькі саркастычна, але і цынічна: за дзеяньнямі Пуціна ніякага жаданьня «паразмаўляць» не назіраецца.

## Саміт думае пра Беларусь

Было б вельмі наіўным лічыць, што Беларусі не тычацца глябальныя праблемы, якія абмяркоўваюцца на саміце. Мы будзем пакутаваць ад зьмены клімату, як і рэштка сьвету. Аднак непасрэдна Беларусь цікавіць усё-такі найперш супрацьстаяньне Буша і Пуціна, якое на сустрэчы ў Гайлігендаме праяўляецца выразна.

Гульні са зброяй у Цэнтральнай Эўропе выглядаюць непрыемна. Чым бліжэй падыходзіць сыстэма ПРА да Расеі, тым большая спакуса для Крамля зноў ператварыць Беларусь у свой ракетны плацдарм. Практычнай карысьці ад тых ракетаў для Расеі — ніякай, бо рэальна ваяваць Крэмль з Захадам не зьбіраецца. Але вось зладзіць гэткае ракетнае шоў, каб яшчэ раз сьцьвердзіць сябе як «супэрдзяржаву», — магчыма. Адпаведна, Захад зацікаўлены, каб такіх шоў не адбывалася. Такім чынам, у бліжэйшай будучыні падвышаецца небясьпека таго, што Беларусь зробіцца аб’ектам маніпуляцыяў ды палітычнага гандлю паміж Захадам ды Ўсходам. Гэта можа пашырыць поле гульні для беларускага рэжыму. Карацей, на тое, што пра нас «забудуцца», спадзявацца ня варта.

У панядзелак, размаўляючы з журналістамі, Пуцін зрабіў цікавую заяву: інтэграцыя на эўразійскай прасторы не абавязкова павінна юрыдычна замацоўвацца. Гэты эўфэмізм можна разумець так: для Расеі на гэтым этапе ўсё больш важным робіцца менавіта эканамічны ўплыў на суседнія краіны, найперш праз пастаўкі энэрганосьбітаў. Фактычна, гэта азначае ператварэньне Расеі ў рэсурсакратыю, якая кантралюе суседзяў не дэ юрэ, а дэ факта. Тады палітычныя праекты накшталт беларуска-расейскага саюзу адыходзяць на другі плян (ці адсоўваюцца на больш далёкую пэрспэктыву).

Канфлікт Пуціна і Буша — гэта ілюстрацыя да новай спрэчкі паміж Захадам і Ўсходам. На саміце выяўляецца яшчэ адна з глябальных праблемаў — супрацьстаяньне паміж двума стратэгічнымі праектамі палітычнага разьвіцьця сьвету: дэмакратычным і аўтарытарным. А калі зірнуць яшчэ больш агульна, галоўная сьветапоглядная праблема саміту — пошук балянсу паміж свабодай і несвабодай. Для Беларусі — вельмі актуальна.

**Алесь Кудрыцкі**

### Хто ёсьць хто ў Вялікай Восемцы

Кідаецца ў вочы, што сярод удзельнікаў саміту ажно тры манумэнтальныя палітычныя фігуры, якія зьбіраюцца сыходзіць з пасады лідэра. Буш ды Пуцін скончаць свае другія прэзыдэнцкія тэрміны налета, Блэр — ледзь не праз два з паловай тыдні. Ёсьць і навічкі — Нікаля Сarказі яшчэ толькі прызвычайваецца да прэзыдэнцкага крэсла.

### Ангела Мэркель — барацьбітка за клімат

Сёлета канцлерка Нямеччыны прымае гасьцей, таму яна ў многім вызначае парадак дня саміту. У цэнтры ўвагі для Мэркель, былой міністаркі аховы наваколься, — выпрацоўка адзінай міжнароднай палітыкі ў барацьбе з кліматычнымі зьменамі. Яе формула: «Аніякіх заганных кампрамісаў». У той самы час яна, аднак, не зьбіраецца заганяць у кут Буша, для якога індустрыйныя інтарэсы сваёй краіны пакуль што пераважваюць экалягічныя.

### Джордж Буш — прынцыповы самастойнік

Даводзіцца прызнаць — нягледзячы на хаос у Іраку, Буш, як і раней, прылятае на саміт кіраўніком вялікай дзяржавы. Ягоны «мэсыдж»: ЗША не адварочваюцца ад сусьветных праблемаў, але маюць права вырашаць іх, не пытаючыся ні ў кога. Буш прывозіць на саміт амбітныя нацыянальныя праекты — разбудову сыстэмы проціракетнай абароны ў Цэнтральнай Эўропе, 30 млрд даляраў на барацьбу са СНІДам у Афрыцы і новую амэрыканскую ініцыятыву па барацьбе з пацяпленьнем клімату.

### Уладзімер Пуцін — раззлаваны дзюдаіст

Можна ўявіць, які выступ мог бы зладзіць дуэт Шродэр–Пуцін пад акампанэмэнт Бэрлюсконі ды сяброўскія жэсты Шырака. Цяперака ў Пуціна «сяброў па лазьні» ў «восемцы» паменшала. Калі не сказаць болей — іх там у яго проста няма. Зрэшты, магчыма, палітычная бойка — акурат тое, што патрэбна чэкісту–дзюдаісту перад прэзыдэнцкімі выбарамі, каб набраць пункты — ці то сабе, ці то пераемніку, а ў любым выпадку — свайму палітычнаму рэжыму.

### Нікаля Саркозі — сьвежанькі гурок

Нікаля Саркозі прэзыдэнцтвуе ў Францыі яшчэ толькі тры тыдні. Да яго прыглядаюцца зь цікавасьцю, як і ён да ўсіх. Пакуль што Саркозі пазыцыянуе сябе як прагматыка, які настроены на прадуктыўны дыялёг з усімі. Да Пуціна ён ставіцца паблажліва — маўляў, Расею трэба супакоіць, да Буша — з большай павагай, чым Шырак, які супернічаў з Амэрыкай. Важныя пытаньні для Саркозі — клімат і Афрыка, адкуль у Францыю ліецца плынь імігрантаў. Рызыкнем выказаць меркаваньні, што менавіта ад Саркозі Пуцін пачуе найбольш прыкрай крытыкі.

### Тоні Блэр — у чаканьні адпачынку

Тоні Блэр стомлены. 10 год на пасадзе прэм’ера — ня жарцікі. Блэр сыходзіць зь вялікай палітыкі прынцыпова і канчаткова. Таму ад яго можна чакаць шырокіх палітычных жэстаў. Палітык можа дазволіць сабе паразмаўляць на тэмы, якія клапоцяць сусьвет. Найперш, бадай, пра клімат — апошнім часам Брытанія надта актыўна працуе ў гэтым накірунку, хоць і пазьбягае надта злаваць свайго галоўнага саюзьніка — ЗША.

### Рамана Продзі — сем раз адмер, адзін адрэж

Продзі, былы прэзыдэнт Эўракамісіі, — профі ў пытаньнях міжнароднага ўзаемадзеяньня на высокім узроўні. Праўда, да галоўных праблемаў саміту мала справы як самім італьянцам, так і ўраду Продзі — хапае ўнутраных праблемаў. Тым больш, што падціскае апазыцыя на чале з Бэрлюсконі, кіроўная кааліцыя бясконца сварыцца... Рэзкіх выпадаў і нестандартных рашэньняў ад яго чакаць ня варта.

### Сіндзо Абэ — аб’яднальнік

Канёк японскага прэм’ера — крытыка Паўночнай Карэі. Для яго важна, каб саміт Вялікай Восемкі як мага больш рашуча запатрабаваў ад Паўночнай Карэі адмовы ад ядзернай праграмы. Сіндзо Абэ таксама прывёз на саміт амбітны плян змаганьня са зьменамі клімату. Галоўны ягоны пункт — удзельнічаць павінны ўсе. Без ЗША, Кітаю і Індыі справа ня ссунецца зь мёртвай кропкі.

### Стывэн Гарпэр — міратворац

Стывэн Гарпэр, канадзкі прэм’ер, зьбіраецца зрабіцца на саміце пасярэднікам, які неяк аб’ядна інтарэсы краінаў восемкі, а таксама іншых буйных краінаў, запрошаных на саміт у якасьці назіральнікаў — Бразыліі, Кітаю, Індыі, Мэксыкі і Паўднёваафрыканскай Рэспублікі. Гарпэр падкрэсьлівае, што зьмяншэньне выкідаў у атмасфэру — адна з галоўных мэтаў Канады, і што іншыя краіны павінны каардынаваць палітыку ў гэтай сфэры, ствараць праграмы ня як альтэрнатыву існуючым праграмам, а як дапаўненьне да іх. Вось толькі як гэта стасуецца з фактычным выхадам Канады з Кіёцкага пратаколу?

# І пра футбол

Піша Віталь Тарас.

## Дакладнасьць прагнозу — 25 %

На Цэнтральным савецкім тэлебачаньні (ЦТ) быў такі дыктар Балашоў. Чытаць афіцыйныя тэксты ў праграме «Час» яму ня надта давяралі. Занадта мяккія ў яго былі інтанацыі. Але ягоную каронную фразу на разьвітаньне ведаў увесь Савецкі Саюз: «І пра надвор'е». У гэтую фразу, а таксама ў шырокую ўсьмешку на твары дыктар укладаў усю сваю душу й сэрца, усё сваё майстэрства — так, як яго вучылі і як ён разумеў сваю прафэсію. У ягонай фінальнай фразе ўтрымлівалася непрапарцыйна шмат аптымізму. Яна гучала як апафэоз тагачаснага савецкага тэлебачаньня.

Але гучала занадта патасна і таму, хутчэй, забаўна.

Таму дыктара, які, да таго ж, з гадамі пачаў дапускаць памылкі, перасунулі на апошнія выпускі навінаў, а потым і ўвогуле перасталі выпускаць у эфір.

У сучасным беларускім інфармацыйным этэры падобныя інтанацыі ўявіць сабе немагчыма. Весткі з палёў гучаць як весткі з франтоў. А весткі пра замежнае жыцьцё — так, каб было зразумела: вораг абавязкова будзе разьбіты. Пад бліскучымі ва ўсіх сэнсах строямі ад модных фірмаў, нават на вядучых жаночага полу, яўна вымалёўваюцца пагоны. Зашпіленыя ўнутры на ўсе гузікі і адмабілізаваныя, вядучыя абодвух палоў гатовыя ў кожны момант даць адпор.

Тым ня менш, ёсьць дзьве тэмы, на якіх сучасныя вядучыя дазваляюць сабе разьняволіцца і гаварыць з гледачом шчыра й эмацыйна — гэта надвор'е й спорт.

Асабліва спорт. Паколькі ад надвор'я, як вядома, залежыць ураджай, яно таксама застаецца аб'ектам стратэгічнай важнасьці, і за ім пільнуе найвышэйшае начальства. Да таго ж, надвор'е — рэч зьменлівая, і таму небясьпечная.

У сацыялістычнай Польшчы прагноз надвор'я па радыё ўмяшчаўся ў адну ўнівэрсальную формулу амаль на ўсе выпадкі жыцьця: «Захмужэне дужэ люб умаркованэ». Дарэчы, гэтая формула выдатна падыходзіць і для апісаньня надвор'я ў Беларусі. Прыкладна ў 80 адсотках выпадкаў...

Не магу ўтрымацца, каб не прывесьці выпадак з адным чэскім кінарэжысэрам (здаецца, гэта быў Мілаш Форман). Перад тым як ехаць здымаць натуру, ён патэлефанаваў у бюро прагнозаў, каб даведацца пра надвор'е ў патрэбнай мясцовасьці. Сыноптыкі абяцалі, што будзе сонечна. А якая верагоднасьць прагнозу? — спытаўся рэжысэр. 25 % — быў адказ. Ясна, значыць, верагоднасьць дажджу — 75 %, падумаў рэжысэр і адмяніў здымкі. У наступныя дні сапраўды ліў дождж.

Што тычыцца спорту, дык тут у нас усё вядома, як правіла, наперад. Колькасьць мэдалёў на алімпійскіх

Працяг на старонцы 26.


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

# Дзякуй

**У.Т., Мікалаю А., Таісе Ж., Аляксандру П., Валер'ю В., Андрэю М., Леаніду Л., Ірыне Ц., А.Л., Георгію М., Натальлі М., Рэгіне Б., Паўлу П., І.М., М.Р., Рагнедзе А., І.У., Віталю Р., Паўлу Н., В.К., Ю.К., Леаніду Р., Аляксандру К., Аляксандру А., Ільясу Х., У.Д., Аркадзю Б., А.К., Аляксею П., Мікалаю Ш., Ніне Ш., Зьмітру Б., Г.Г., Аляксею П., Марыі І., Валянціне К., Натальлі З., Зоі С., Лідзіі І., Ігару Б., Андрэю Ш., Рэгіне К., Валянціне В., Кастусю Ж., Міхалу З., Лідзіі Б., Галіне Р., Т.К., Т.К., Ізмаілу А., Ірыне І., В.Н., Э.К., Марыі А., Раісе К., Тацяне Р., Генадзю Б., Алегу А., Інэсе Б., Яўгену М., Ніне К., Сьвятлане В., В.Д., Мікалаю М., Мікалаю С., Н.Ю., Генадзю Б., Вадзіму М., Яўгену І., Віктару М., Веры С., Ігару Д., Міхаілу К., А.М., Р.С., Пятру К., Адаму М., Натальлі Г., Мікалаю К., Андрэю Н., Георгію Ш., Віктару К., Я.А., Натальлі Г., Мікалаю К., Андрэю Н., Віктару К., Я.А., Ю.Л., Сержуку Т., Аляксандру М., Аляксандру Ф., Валянціне Л., Алесю Дз., Элі С., Ніне Ш., Марыне З., У.Дж., Тацяне М., Мікалаю У., Н.Ю., Канстанціну Ш., А.С., Георгію П., Людміле Л., Алесю С., Аляксандру Р., Альберту С., Уладзімеру Р., Ірыне З., Ігару С., Уладзімеру І., Л.І., Уладзімеру Ж., Любаміру Р., Барысу А., Але Т., А.Л., Аляксандру Я., А.А., Іне К., В.М., Міхаілу М., Анатолю Л., Анастасьсі Ж., М., Натальлі Д.** зь Менску.

**Паўлу С.** з Горак.

**Стэфану Н., Руслану К., Алегу Р., Алесю М.** з Наваполацку.

**Яўгену Ф., Алегу С.** з Бабруйску.

**Сяргею Ц.** з Докшыцкага раёну.

**Вользе А.** зь Любанскага раёну.

**Леаніду А.** з Гарадоцкага раёну.

**Тацяне К., Раісе Д., Сяргею К.** з Салігорску.

**Віктару А., Андрэю С.** з Магілёва.

**Аляксандру Ц.** з Шумілінскага раёну.

**Анатолю С.** са Жлобіну.

**Аляксандру Д.** з Карэліцкага раёну.

**Сяргею П.** зь Лідзкага раёну.

**Барысу Я., Яўгену К., Генадзю К., Н.К.** зь Менскага раёну.

**Сяргею К., В.В.** з Маладэчна.

**Уладзімеру Т.** з Жабінкаўскага раёну.

**Дзянісу А., Сяргею Д.** з Узьдзенскага раёну.

**Уладзімеру Х., Канстанціну К.** з Шаркоўшчынскага раёну.

**Барысу С., Ігару С., Віталю Г.** з Чачэрскага раёну.

**Мікалаю К.** з Валожынскага раёну.

**Івану Д., В.П.** зь Мядзельскага раёну.

**Сьцяпану А.** з Асіповіцкага раёну.

**Станіславу Б.** з Лунінца.

**Мікалаю Т.** з Лунінецкага раёну.

**Вячаславу С., Уладзімеру А.** з Баранавіч.

**В.Ч., Леанарду М., І.Дз., Андрэю К.** зь Берасьця

**Васілю К., Валер'ю Д., Любові П., Лідзіі С., Вадзіму Л., Міхаілу Б., Я.К., С.І., Генадзю Л., Марыі Б., Я.Б., Зьмітру П.** з Гомелю.

**Рыгору К., Юру К., Анатолю С.** з Мазыра.

**Георгію С.** з Воршы.

**Вячаславу П.** зь Пінску.

**Анатолю І.** з Чэрвеньскага раёну.

**Івану Л., Надзеі Р.** зь Вялейкі.

**Васілю К., Любові Л., Л.Ш.** зь Віцебску.

**Ф.А., Сьвятлане К.** зь Ліды.

**Івану Л.** з Мастоўскага раёну.

**С.Ж.** з Клецкага раёну.

**Сяргею А.** з Клімавіч.

**Анатолю П., Марыне Я., С.Н., Антону Т., Тамары К.** з Жодзіна.

**В.К., Віталю Б., Ларысе Ц., Аляксандру Ф., Аляксею П., Сяргею К., Алене С., С.А., Алене Г., Аляксандру А., А.К., Г.К.** з Горадні.

**Аляксандру З., Міхаілу Б., Антосю Ц.** з Полацку.

**Андрэю Х.** зь Мёрскага раёну.

**В.Н.** з Капылю.

**Уладзімеру М.** з Гомельскага раёну.

ПАВЕДАМЛЕНЬНЕ

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828

МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Менск, код 764

Рахунак атрымальніка **3012 206 280 014** Асабовы рахунак

(прозьвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| За газэту "Наша Ніва" | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | Агулам | |

Касір

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828

МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Менск, код 764

Рахунак атрымальніка **3012 206 280 014** Асабовы рахунак

(прозьвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| За газэту "Наша Ніва" | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | Агулам | |

КВІТАНЦЫЯ

Касір М.П.

## Каб штотыдзень атрымліваць газэту,

**дасылайце адрасы і грошы за газэту.**

1) Просім усіх ахвотных чытаць газэту **паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць праз:** тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32 (МТС), (029) 618-54-84, e-mail: dastauka@tut.by, паштовы адрас: а/с 537, 220050 Менск.

2) **Просім у блянку банкаўскага паведамленьня ці паштовага перακазу дакладна і разборліва пазначайце адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад'езду.**

## Пра беларусізацыю сотавых тэлефонаў

**Нядаўна мы набылі новую слухаўку Samsung. Тэлефон добры, стылёвы дызайн, у наладках ёсьць 16 моваў мэню, у тым ліку амаль усіх нашых краінаў-суседзяў — расейскай, украінскай, літоўскай, латыскай. Але няма беларускай.** І гандляр, што прадаў нам слухаўку, ня змог нават адказаць на пытаньне «Чаму ў Беларусі няма мэню тэлефона на беларускай мове?», бо гэта пытаньне не зь яго кампэтэнцыі.

Беларусь застаецца адзінай краінай у Эўропе, для якой не вырабляюцца мабільныя тэлефоны з мэню на нацыянальнай мове. Гэта проста непавага, абраза нашай краіны, разгляданьне яе толькі як тэрыторыі для збыту сваіх тавараў.

З разьвіцьцём сотавай сувязі ў Беларусі зьяўляюцца спажыўцы, якія хацелі б карыстацца слухаўкамі менавіта на сваёй мове. Я бязь цяжкасьцяў знайшоў толькі сярод сваіх знаёмых, сяброў і сваякоў паўтара дзясятку чалавек, што актыўна падтрымалі гэтую прапанову.




ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

Лідэрам на беларускім рынку слухавак ёсьць паўднёвакарэйская карпарацыя Samsung. Яна лідзіруе і ў «беларусізацыі» — працяглы час падае слоганы сваёй прадукцыі ў вонкавай і тэлевізійнай рэкламе на беларускай мове.

Беларусізацыя тэлефоннага софту хутчэй за ўсё адбылася б праз гэтую кампанію. Яна магла б дасылаць беларускамоўнае праграмнае забесьпячэньне ў Менск, у свой фірмовы рамонтна-сэрвісны цэнтар «Асьпірс». А тэкст праграмы, як мне казалі спэцыялісты, займае каля дзьвюх старонак. Пераклад можна было б зрабіць з дапамогаю валянтэраў, напрыклад, з Таварыства беларускай мовы.

Я сам напісаў ліст-просьбу ў галоўны офіс карпарацыі Samsung у Сэуле і ў рэгіянальнае прадстаўніцтва ў Кіеве (у Беларусі няма фірмовага цэнтру *продажу* слухалак). Але «маўчаньне было мне адказам». Мабыць, адна пчала мёду не наносіць... Калі б карпарацыя атрымала шмат лістоў, гэта было б падставаю ўпэўніць кіраўніцтва й зрушыць сытуацыю.

Я зьвязваўся з прадстаўніком Samsung-у ў Беларусі, але яна не прымае рашэньні такога ўзроўню.

І зь дзяржаўных органаў, што рэгулююць дзейнасьць у галіне мабільнай сувязі, прыйшлі бюракратычныя адпіскі. Рэальным крокам было б, каб вырабнікам сотавых тэлефонаў паведамілі, што надалей у Беларусі будуць стандартызавацца толькі новыя слухаўкі, у якіх можна ўсталяваць мэню на беларускай мове. Але Дзяржкамітэт па стандартызацыі заявіў, што ня мае ўплыву на стандартызацыю слухавак, а толькі вызначае патрабаваньні да сыстэмы сувязі й рамонту сотавых тэлефонаў. Між радкоў ліста Міністэрства сувязі чытаецца, што ім ня трэба мэню ў сотавых тэлефонах на нацыянальнай мове («белорусский и русский языки ... являются равноправными, и ни один из них не является доминирующим»).

Хачу зьвярнуцца да чытачоў газэты з просьбаю дасылаць лісты (пажадана па-ангельску) у кампанію Samsung, з просьбаю распрацаваць софт для мабільных тэлефонаў у Беларусі на беларускай мове.

Адрасы для дасылкі лістоў: Інфармацыйны Цэнтар Samsung для спажыўцоў, а/с 140, Кіеў—70, УКРАІНА 04070 або: Samsung Electronics Co. Ltd, Samsung Main Bldg., 250 Taepyung Ro, 2Ga, Chung Ku, Seoul, KOREA, 100742.

Прашу таксама выказаць свае меркаваньні па гэтым пытаньні — буду рады прапановам і ўдакладненьням, якія можна даслаць мне: via123cheslav@tut.by.

**Вячаслаў К., Менск**

## «Мы хазяева Явропы!!!»

**2 чэрвеня 30 тысячаў аматараў футболу сабраў стадыён «Дынама» ў Менску** на гульню Баўгарыя–Беларусь. Яшчэ каля сотні прыйшло на Кастрычніцкую плошчу, дзе традыцыйна трансьлююць усе важныя мерапрыемствы краіны. На гэты раз праграму «Панарама», дзе не было ні адной жыцьцёвазначнай навіны пра Беларусь, палічылі больш значнай, чым першы тайм гульні ( і гэта ў краіне, дзе спорту надзяляецца ЎВАГА з боку дзяржавы...). Абураныя фанаты сьвісьцелі, крычалі «Давай футбол!», нэрвова пераступалі з нагі на нагу, расстройваліся, сварыліся, але ўсё адно чакалі: міліцыянты пераканалі, што другі тайм будзе паказаны.

А 21.55 пад радаснае «Бела-русь!» пачалася трансьляцыя. «Нашым» ужо пасьпелі забіць гол, але фанаты шчыра крычалі: «Верым у каманду!», «О-le, о-le, о-le, Беларусь — чэмпіён!»

Кожны раз, калі мяч быў у нашых, гучна сустракалі: «Дава-а--а-а-й!» — і гэтак жа гучна праваджалі: «Э-э-х! Мазіла!» «Мы хазяева Явропы», — крычалі наперадзе. Крычалі гучна, нібы пераконваючы саміх сабе. Камэнтатар спрабаваў супакоіць: «Мы павінныя помніць, што Баўгарыя — футбольная краіна».

Піва ў бутэльках станавілася ўсё менш, гульня падыходзіла да канца. Заўзятары разыходзіліся чамусьці пад крыкі «БНТУ!».

На аўтобусным прыпынку хлапец са сьцягам супакойваў: «Возьмем 6-га рэванш!» Сяброўка суцяшала тым, што «хоць гульня і жудасная, але хто за іх будзе хварэць, калі ня мы?».

А я, угледаючыся ў расстроеныя твары заўзятараў, пераканалася, што ўсё трымаецца на энтузіязьме. Сапраўднага футболу мы так і ня ўбачылі...

**Адар'я Гуштын, Менск**

## Кангрэс адбыўся 19 сакавіка

**Сапраўдны Кангрэс аб'яднаных дэмсілаў адбыўся 19 сакавіка 2006 г. на плошчы Каліноўскага.** На адданасьць Беларусі дэлегатаў праверыла мандатная камісія — Лукашэнка, Шэйман, Сухарэнка, Навумаў, Паўлічэнка.

26–27 траўня адбыўся сход партыйных групаў. Зь якіх ня ўсе зьяўляюцца дэмакратычнымі: недастаткова выступаць супраць Лукашэнкі, каб называцца дэмакратамі. Парушаць дэмакратычныя працэдуры, змагаючыся за ўладу, — значыць быць арыентаваным на тое, каб парушаць дэмакратычныя прынцыпы, маючы ўладу.

Ня ўсе былі апазыцыйнымі. Пэўныя групы змагаюцца не з Лукашэнкам, а зь яго праціўнікамі.

Ня ўсе зьяўляюцца незалежнікамі. Пэўныя групы фінансуюцца Расеяй.

Ня ўсе зьяўляюцца беларускімі. Бо апраўдваюць сталіншчыну, злачынствы. Зьяўляюцца ідэалягічнымі хаўрусьнікамі рэжыму ў стаўленьні да беларускасьці.

Вынікам сходу павінна быць ачышчэньне апазыцыі ад бруду і балясту.

**Андрэй Ляховіч**

## Яшчэ пра Ўладзімера Каткоўскага

**У Празе спынілася сэрца Ўладзімера Каткоўскага.** Пасьля вусьцішнай аўтакатастрофы ён амаль цэлы год правёў у коме.

Уладзю не вярнуць. Але там, яму будзе лягчэй, калі мы не забудземся на ягоных бацькоў Арыну й Лявона, якія зрабілі за гэны год, усё (і нават болей), што было ў іх моцы, сястрычку (дзяўчына, як паказалі падзеі часоў Плошчы, годная свайго брата) і, вядома, жонку Ўладзі Янаду, якая сталася зусім нашай, сваёй. Бо праверка нацыі на годнасьць — гэта ня толькі «сьцягі ды лёзунгі», а найперш — дапамога сваім.

Пагатоў, спадчыны Ўладзімер Каткоўскі пакінуў нямерана. Асабліва беручы пад увагу колькасьць пражытых гадоў. Адна толькі годная аўтара-заснавальніка падтрымка сайтаў чаго варта! А абагульненьне думак Уладзі наконт лёсу мовы й пошуку шляхоў па выхадзе з духова-мэнтальнае крызы, у якой знаходзіцца нашае грамадзтва!

Бо тыя праблемы, якія ён неаднакроць выносіў да карыстальнікаў байнэту, нікуды не падзеліся.

**Вадзім Александровіч**


Юлія Дарашкевіч

# Малітва пратэсту

У нядзелю 3 чэрвеня каля менскай царквы «Ласка Божая» адбылася агульнагарадзкая малітва эвангельскіх хрысьціян. Малітва была адказам на ціск уладаў на суполку «Ян Прадвесьнік». Пратэстанты патрабуюць зьменаў у закон аб свабодзе сумленьня.

Удзел у малітве ўзялі біскупы трох асноўных пратэстанцкіх плыняў — баптыстаў (Мікалай Сінкавец), пяцідзясятнікаў (Сяргей Хоміч), харызматаў (Вячаслаў Ганчарэнка). У малітве ўзялі ўдзел каля пяці тысяч чалавек, 60 пастараў.

Вячаслаў Ганчарэнка ў сваім выступе адзначыў, што, каб нечага дамагчыся, трэба кіравацца трыма правіламі: «Ня бойцеся! Ня бойцеся! Ня бойцеся!»

Апроч малітваў, было выканана некалькі рэлігійных песьняў, у тым ліку і на беларускай мове. Пры канцы акцыі біскупы ад імя сваіх грамадаў прынялі зварот да А.Лукашэнкі.

У той самы дзень міліцыянтамі быў затрыманы пастар царквы Яна Прадвесьніка Антон Бокун, якога адвезьлі на Акрэсьціна, а назаўтра далі трое сутак арышту за правядзеньне богаслужэньня ва ўласным доме. Таксама ў нядзелю ў праграме «Контуры» на тэлеканале АНТ быў паказаны рэпартаж пра рэлігійныя сэкты, да ліку якіх былі аднесеныя і пяцідзясятнікі.

**Зьміцер Панкавец**

## 1 чэрвеня

### Маладафронтаўцаў не пакідаюць

Актывістаў незарэгістраванага «Маладога фронту» **Насту Азарку** зь Нясьвіжу і **Паўла Красоўскага** з Жодзіна выклікалі ў Менскую аблпракуратуру. Актывістаў дапытвалі ў рамках крымінальнай справы па факце ўдзелу ў МФ непаўналетняга салігорца **Івана Шылы**. У аддзел КДБ у Баранавічах быў выкліканы **Мікола Агароднік**. Ён мусіў даць паказаньні ў справе прыналежнасьці да «Маладога фронту» актывіста з Баранавічаў **Ярослава Грышчэні**.

### Донары страйкуюць

У Магілёве больш за 100 ганаровых донараў пастанавілі правесьці папераджальную тыднёвую забастоўку супраць адмены льготаў. Калі гэта ня дасьць вынікаў, пачнецца бестэрміновы страйк. Донары абяцаюць зьяўляцца на пункты здачы крыві толькі ў выпадках, калі кроў будзе трэба дзецям ці людзям, чыё жыцьцё ў небясьпецы. Пратэст выкліканы адменай 50% зьніжак на пратэзаваньне зубоў і лекі ды 40% прыбаўкі да пэнсіі.

### Труну насілі

На Нямізе некалькі дзясяткаў навучэнцаў вынесьлі сымбалічную труну з надпісам «Ільготы». Наперадзе пахавальнае працэсіі несьлі вялікі льготны талёнчык у чорнай рамцы. Міліцыянты затрымалі **Паўла Вінаградава, Паўла Чумакова, Аляксандра Барадзенку, Вадзіма Баравіка, Паўла Вільтоўскага** і **Паўла Маркевіча**. Тры ночы яны правялі на Акрэсьціна. Супраць **Ільлі Шуста** міліцыянты ўжылі фізычную сілу. Хлопец цяпер знаходзіцца ў шпіталі.

Судзьдзя Цэнтральнага раёну Менску **Т.Паўлючук** на працягу панядзелка 4 чэрвеня вынесла прысуд усім шасьці хлопцам. П. Вінаградаў атрымаў 5 сутак арышту, П. Маркевіч, П. Чумакоў, А. Барадзенка, П. Вільтоўскі — 3.Усіх іх асудзілі па арт. 23.34 АК (удзел у несанкцыянаванай вулічнай акцыі). В. Баравіка асудзілі на 3 сутак за ўдзел у акцыі, а таксама далі штраф у 20 б.в (620 тысяч рублёў) за супраціў міліцыянтам.

У Магілёве падчас пікету супраць адмены льготаў затрымалі **Аляксандра Анісімава** ды **Аляксандра Шарабурку** за спробу разгарнуць бел-чырвона-белы сьцяг. Матэрыялы адміністрацыйнай справы перададуць у пракуратуру.

## 2 чэрвеня

### Расьцяжка і сьвечкі над Горадняй

У Горадні а 20-й гадзіне на мосьце цераз Нёман, які зьбіраюцца пашыраць, моладзевыя актывісты запалілі сьвечкі і вывесілі расьцяжку з надпісам «Абарані свой горад!» Міліцыя затрымала 5 чалавек: **Кацю Галіцкую**, **Зьмітра Лісіенку**, **Ільлю** й **Івана Шылаў** (14 і 16 гадоў), **Андрэя Ігнатовіча**. Расьцяжка вісела каля 5 хвілін. Затрыманых пратрымалі ў пастарунку 2 гадзіны, узялі тлумачэньні й адпусьцілі без складаньня пратаколу.

## 3 чэрвеня

### Пастар Бокун

Пастар менскай царквы ХВЭ «Ян Прадвесьнік» **Антоні Бокун** быў затрыманы падчас правядзеньня абраду хлебапраламленьня (прычасьця) у будынку, які арэндуе царква на Даўгінаўскім тракце ў Менску. Пастара адвезьлі ў Цэнтральны РУУС, дзе на яго быў складзены пратакол за правядзеньне несанкцыянаванага сходу. На наступны дзень суд Цэнтральнага раёну пакараў сьвятара 3 суткамі арышту. Гэта ўжо другое затрыманьне Антонія Бокуна. У мінулую нядзелю, 27 траўня, падчас сьвяткаваньня Пяцідзясятніцы (Сёмухі) ён быў затрыманы на суткі й аштрафаваны на 620 тысяч рублёў «за правядзеньне несанкцыянаванага масавага сходу».

## 4 чэрвеня

### Абаронцаў Горадні зноў затрымалі

Каля дзесяці чалавек затрымалі гарадзенскія міліцыянты каля будынку флігеля XVIII ст. Усе затрыманыя — іншагароднія. Сярод іх: **Яраслаў Грышчэня**, **Зьміцер Лісіенка** і **Андрусь Ігнатовіч**.

Маладыя людзі ледзь пасьпелі падысьці да флігеля, які цяпер разьбіраюць будаўнікі. Маладзёнаў адвезьлі ў РУУС Ленінскага раёну для высьвятленьня асобаў, адкуль праз некаторы час усіх адпусьцілі без складаньня пратаколу.

### 20 тысячаў подпісаў

Каля 20 тысяч подпісаў сабрана зь сярэдзіны сакавіка пад зваротам да кіраўніка дзяржавы за вяртаньне вернікам комплексу будынкаў менскага кляштару бэрнардынцаў, разьмешчаных па вуліцы Кірыла і Мяфодзія, 4, 6, 8.

### Забаранілі пікет

Сустаршыня аргкамітэту партыі Беларуская Хрысьціянская Дэмакратыя і заяўнік акцыі **Аляксей Шэін** атрымаў адмову зь Менгарвыканкаму на правядзеньне пікету ў абарону свабоды сумленьня. Акцыя мела адбыцца 8 чэрвеня на плошчы Бангалор. Чыноўнікі нібыта мелі пытаньні да дакумэнтаў, прадстаўленых заяўнікамі акцыі. Гэта ўжо другая адмова ўладаў. Падобная акцыя мела адбыцца напрыканцы сакавіка на плошчы Свабоды ў Менску. Тады гарадзкія ўлады адмовілі заяўнікам па той прычыне, што пікет, нібыта, будзе ствараць перашкоды для руху грамадзянаў.

## 5 чэрвеня

### У Вузьдзе

Участковы інспэктар міліцыі маёр **Сяргей Бурло** прыйшоў на працу да прадпрымальніка **Віктара Крываля**, актывіста Грамады, каб правесьці зь ім «прафіляктычную гутарку», у прыватнасьці, пазнаёміць з арт.342 КК. Артыкул гэты хітры: «Арганізацыя групавых дзеяньняў, якія груба парушаюць грамадзкі парадак»... А справа ў тым, што 17 траўня на кватэры Крываля адбыўся сход прадпрымальнікаў з трох раёнаў вобласьці. На гэтым сходзе была заснавана Менская абласная арганізацыя прафсаюзу прадпрымальнікаў. Вось улады і вырашылі папалохаць.

**СП**

# Як на далоні

Вырас індэкс даверу да недзяржаўнай прэсы.

Сьвежае апытаньне, зладжанае сацыёлягамі НІСЭПД, дало вынік, бясспрэчна прыемны для незалежнай мэдыя-супольнасці. За мінулыя паўгоду рэзка вырас індэкс даверу недзяржаўнай прэсе. Яшчэ болей: паводле гэтага паказчыку, незалежныя СМІ апярэдзілі дзяржаўныя.

Аўтары дасьледаваньня вызначаюць гэты індэкс як «суадносіны рознасьці колькасьці тых, хто давярае, і тых, хто не давярае, да колькасьці тых, хто адказаў на пытаньне».

Дык вось, летась у лістападзе незалежная прэса мусіла задавальняцца паказчыкам -0,076, а вось сёлета ў траўні займела +0,152. Дзяржаўныя ж мэдыі заўважна спаўзьлі: з +0,207 да +0,114. Яшчэ некалькі цікавых лічбаў: давяраюць незалежным СМІ 50,6% апытаных, не давяраюць — 35,5%. У дзяржаўнай прэсы — адпаведна 51,0% і 39,7%.

Гэтую, са слоў сацыёлягаў, «ракіроўку індэксаў» варта разглядаць у болей шырокім кантэксьце. Дасьледчыкі робяць выснову, што «галоўная асаблівасьць дынамікі індэксаў даверу дзяржаўным і грамадзкім інстытутам за апошнія паўгоду заключаецца ў росьце гэтага паказчыка ў грамадзкіх інстытутаў і падзеньні — у дзяржаўных».

Аўтары дасьледаваньня лічаць гэта наступствам «нафта-газавай вайны». І прыводзяць сьвежы прыклад, калі афіцыёз фактычна прамаўчаў наконт нядаўняга падпісаньня дамовы з «Газпромам» аб продажы «Белтрансгазу». «Дзяржаўныя СМІ набралі ў рот вады, а гаворка ж ідзе не аб продажы камэрцыйнага шапіка, а аб частцы беларускага «фамільнага срэбра»!» — адзначаюць сацыёлягі. Яны нагадваюць: год таму 82% беларусаў выказвалі меркаваньне, што прадаваць газатранспартную сыстэму ня варта ні пры якіх абставінах. «Вось і даводзіцца «народнай» уладзе ўтойваць ад народу свае ўчынкі», — робяць выснову адмыслоўцы НІСЭПД.

Такім чынам, усё проста. Пакуль дабрабыт рос дзякуючы танным энерганосьбітам, значная частка грамады была схільная паверыць у казку пра беларускі цуд, не адчувала раздражненьня ад прапаганды. Калі ж грымнула «нафта-газавая вайна», а потым сталі вылазіць бокам яе наступствы — папаўзьлі ўгору камунальныя тарыфы, цэны, сталі скасоўвацца льготы і г.д. — як на далоні выявілася няшчырасьць і бездапаможнасьць падпарадкаваных кіроўным вярхам мэдыяў.

Прапаганду хістала з боку у бок: ад інтэграцыйнай рыторыкі да праклёнаў на адрас расейскіх вярхоў, ад бадзёрых рапартаў, што эканоміка вытрымала ўдар, да заяваў, што без адбіраньня льготаў у інвалідаў нашы фінансы ляснуцца... А самыя нявыгадныя рэчы, што сьведчаць пра фіяска ранейшых абяцаньняў, наверсе палічылі за лепшае і ўвогуле ахутаць маўчаньнем.

Людзі ж пацягнуліся да праўды. І аказалася, што менавіта незалежныя СМІ — выкінутыя з шапікаў і каталёгаў, выціснутыя ў эміграцыю і віртуальны абсяг — засталіся адзінымі крыніцамі поўнай інфармацыі і ўсебаковага аналізу хвалюючых праблемаў.

Вядома, дынаміка згаданага рэйтынгу не падстава для эйфарыі. Бо самыя балючыя праблемы недзяржаўнай прэсы так і ня вырашаныя. У прыватнасьці, рэпрэсаваныя некалі выданьні так і не зьявіліся ў падпісных каталёгах. Умовы дзейнасьці незалежных і дзяржаўных мэдыяў па-ранейшаму няроўныя.

Ну а тое, што нават ва ўмовах дыскрымінацыі адбылася пераможная для незалежных СМІ ракіроўка, лішні раз даводзіць перавагі вольнага слова над казённым.

**Алесь Уладамірскі, baj.by**

# Чаму нас няма на чэмпіянатах сьвету?

Бербатаў паехаў рыхтавацца да матчу зборнай, Глеб — адпачываць на Канары.

2 чэрвеня нацыянальная футбольная зборная правяла ў Менску адборачны матч да першынства Эўропы-2008. Нашы прайгралі баўгарам — 0:2. Атрымалі па заслугах.

Пасьля гэтай паразы беларусы згубілі практычна ўсе шанцы трапіць на чэмпіянат Эўропы. Беларусь ад 1992 г., калі яна правяла першы афіцыйны матч, яшчэ ніколі не гуляла на топ-спаборніцтвах.

Сілу баўгар можна супаставіць зь сілай беларусаў. Характэрна, што ў суботу два галы нам забіў лідэр баўгарскай каманды Дзімітар Бербатаў. Наш лідэр Глеб быў здольны толькі на тое, каб бясьсільна разводзіць рукамі.

Глеб і Бербатаў адразу па сканчэньні чэмпіянату прэм'ер-лігі накіраваліся па розных адрасах. Бербатаў на радзіму, каб рыхтавацца да матчу зборнай, Глеб жа адправіўся адпачываць на Канары, таму і быў непадрыхтаваным да гульні.

Малодшага брата Аляксандра Глеба Вячаслава Пунтус выпускае на поле, толькі каб ён атрымаў брытанскую працоўную візу.

Дзівіць, што пасьля матчу ніводзін з гульцоў зборнай у суботу не падышоў да трыбунаў, каб падзячыць заўзятарам...

Выніку ад зборных ня будзе, пакуль дзіцячыя трэнэры атрымліваюць жабрацкія заробкі і сьпіваюцца. Пакуль малым зь менскага «Дынама» даводзіцца трэніравацца на асфальце. Такі стан рэчаў у нас ня толькі ў футболе, але ва ўсіх гульнявых відах спорту (апроч хакею). Пакуль мы ня вырашым гэтыя праблемы, чэмпіянаты сьвету будуць праходзіць бяз нас.

**Зьміцер Панкавец**

# Пачатак асымэтрычнае вайны

Шасьцідзённая вайна 1967 году кардынальна зьмяніла расклад сілаў і ўяўленьняў пра сучасную вайну. Піша **Сяржук Вінаградаў**.

Шасьцідзённая вайна паміж Ізраілем ды ягонымі арабскімі суседзямі, саракагодзьдзе якое адзначаецца на гэтым тыдні, кардынальна зьмяніла суадносіны сілаў на Блізкім Усходзе. Калі да 1967 году гаворка вялася пра выжываньне Ізраілю, то пасьля яго ён паўстаў як рэгіянальная звышдзяржава. Зь іншага боку, нечаканая перамога Ізраілю зрабіла суадносіны варагуючых бакоў больш асымэтрычнымі й гэтак запачаткавала новы від канфлікту, характэрны для сучаснага сьвету.

Посьпех неспадзяванага нападу ізраільскае авіяцыі на эгіпэцкія паветраныя сілы, якія былі зьнішчаныя за лічаныя гадзіны, ды пераможны паход ізраільскага дэсанту на Ерусалім прадэманстравалі татальную перавагу тэхналягічна абсталяванага войска заходняга ўзору над шматлюднымі, але недзеяздольнымі вайсковымі адзінкамі краінаў трэцяга сьвету. Відавочная безнадзейнасьць лабавога супрацьстаяньня з заходнімі дэмакратыямі прывяла да шырэйшага пераасэнсаваньня радыкальнымі антызаходнімі групоўкамі іх вайскова-палітычнае стратэгіі. Далейшыя атакі на Ізраіль насілі больш кропкавы й правакацыйны характар і пачалі намацваць слабасьці лібэральных дэмакратыяў.

Замест адкрытага вайсковага супрацьстаяньня асымэтрычныя канфлікты прадугледжваюць стварэньне й падтрымку радыкальных парамілітарных груповак партызанскага кшталту, якія выконваюць падвойную функцыю. Па-першае, нешматлікасьць і мабільнасьць груповак робіць іх напады на рэгулярныя часткі праціўніка нечаканымі й больш эфэктыўнымі. Па-другое, наўмыснае базаваньне актыўных напаўвайсковых адзінак сярод мірнага насельніцтва спрычыняе значную колькасьць цывільных ахвяраў, што выкарыстоўваюцца для ідэалягічнае дыскрэдытацыі мацнейшага боку. Пры гэтым мэдыйная прастора ды альтэрнатыўныя палітычныя плыні праціўніка ці трэціх краінаў выступаюць як праваднікі інтарэсаў слабейшага боку ў асымэтрычным канфлікце.

Далейшае разьвіцьцё блізкаўсходняга супрацьстаяньня дэманструе параўнальную пасьпяховасьць мадэлі асымэтрычнае вайны, якую вялі супраць Ізраілю як на ідэалягічным, так і на мілітарным фронце. Прыкладам, праз апэляваньне да левалібэральных палітычных колаў Захаду былі створаныя ідэалягемы пра ізраільскую акупацыю фантомнае палестынскае дзяржавы й пра мірных арабаў-палестынцаў, якія нібыта сталі ахвярамі ізраільскае агрэсіі. Пры нэўтральным разглядзе слушнасьць гэтых ідэалягемаў выглядае сумнеўнай. Гэтак, тэрыторыі Заходняга берагу ракі Ярдан ды сэктару Газа, занятыя Ізраілем у выніку шасьцідзённае вайны, першапачаткова кантраляваліся адпаведна Ярданіяй і Эгіптам. Ідэя стварэньня асобнае арабска-палестынскае дзяржавы разьвілася толькі пасьля фактычнае адмовы суседніх арабскіх краінаў ад страчаных у выніку распачатае імі вайны земляў. Зь іншага боку, цяперашнія ўнутрыарабскія сутыкненьні ў сэктары Газа й Лібане дэманструюць растучы рэлігійны радыкалізм у арабскіх грамадзтвах і ставяць пад пытаньне падрыхтаванасьць палестынскіх арабаў да дзяржаўнага жыцьця. Тым ня менш, сярод значнае часткі заходніх інтэлектуалаў перамог арабацэнтрычны погляд на канфлікт, што азначае фактычную паразу Ізраілю ў ідэалягічнай вайне.

І ўсё ж, заступніцтва заходніх левалібэралаў можа стацца для палестынцаў мядзьведжай дапамогай. Прыкладам, хваля байкатаваньня ізраільскіх акадэмічных установаў і гандлю, якая цяпер набывае моц у Заходняй Эўропе, наўрад ці палепшыць цяжкае становішча палестынцаў. У рэшце рэшт, наіўна спадзявацца, што праз аднабаковы ціск на Ізраіль можна пазбыцца глыбокіх супярэчнасьцяў, якія сталіся прычынай жорсткага супрацьстаяньня на Блізкім Усходзе. Горш за тое, доўгатэрміновая ізаляцыя Ізраілю апынецца контрапрадуктыўнай, бо правакуе арабаў адмовіцца ад памяркоўнасьці й дыялёгу з суседам.



Што ж да мілітарнага фронту асымэтрычнага канфлікту, няпэўныя вынікі Другое лібанскае вайны ўлетку 2006 году ў чарговы раз засьведчылі неэфэктыўнасьць авіяцыі й танкавых частак у змаганьні супраць добра ўзброенае парамілітарнае пяхоты. Гэтак рэпутацыя ізраільскага войску была пастаўленая пад сумнеў, што ўзмацніла рэваншысцкія сілы ўнутры арабскіх краінаў.

Сучасны досьвед паказвае, што, нягледзячы на зацікаўленасьць мацнейшых бакоў у хуткім разьвязаньні канфліктаў, асымэтрычныя канфлікты маюць тэндэнцыю да зацягваньня. Акрамя араба-ізраільскага супрацьстаяньня прыкладам можа служыць прысутнасьць заходняе кааліцыі ў Іраку й Аўганістане, якая, верагодна, застанецца фактам геапалітычнага жыцьця на бліжэйшы час. Відавочна, ужываньне вайсковых сродкаў само па сабе звычайна не прыводзіць да жаданае разрадкі. Альтэрнатыўным падыходам можа быць спроба зьмяніць стратэгічную расстаноўку сілаў у канфлікце. Гэтак, лягічнай падаецца ідэя прыняцьця Ізраілю ў NATO, падтрыманая, між іншым, былым міністрам замежных справаў Нямеччыны Ёшкам Фішэрам. Сяброўства Ізраілю ў NATO дало б гэтай краіне патрэбныя гарантыі бясьпекі й зрабіла б ейны адыход зь пераважна арабскіх тэрыторыяў менш рызыкоўным. Акрамя таго, гэта магло б дапамагчы прадухіліць небясьпечны экзыстэнцыйны канфлікт Ізраілю з Іранам. Аднак жа ў зьвязку з моцнымі антыізраільскімі настроямі ў заходнеэўрапейскіх палітычных элітах уступленьне Ізраілю ў NATO выглядае пакуль што маларэальным. Гэта можа азначаць, што блізкаўсходні асымэтрычны канфлікт усё яшчэ далёкі ад мірнага вырашэньня.



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

# Права лета

Уводзіны ў моду летняга сэзону — адмыслова для тых, каму ў такую сьпёку лянота хадзіць далей, чым па любімую газэту. Піша **Тэда Лі**.

## Карцінкі на дзяўчатах

Аголены прыкус беднага Ёрыка — ілюзія сьмяротнай усьмешкі — гэта малюнак, які дызайнэры сёлета намагаюцца нацягнуць на грудзі кожнай дзяўчыне. На тоненькіх тканінах маечак, побач з сэрцайкамі і кветачкамі, шчэрацца чарапы і скрыжоўваюцца косткі. Схадзіце на апошнюю частку «Піратаў Карыбскага мора» — можа быць, вы таксама захопіцеся пірацкай эстэтыкай на ўсё гэтае лета.

Вы ня любіце мора і піратаў? Хочаце прыгодаў на зямлі? Сярэднявечная геральдыка і могілкавыя гатычныя літары — тое, што ў спалучэньні зь лёгкай летняй маечкай або баксэрскай майкай на стройным дзявочым стане нараджае вясёлую іранічную эклектыку.

Сэрцы бравых рыцараў, guns, roses і вострыя шыпы на ружавых сьцяблінах. Чорна-белая ружа, praткнутая праз сэрца вашага Дон-Кіхота, ці ружа, якая калючым сьцяблом абвівае яго меч? Заканадаўцы модаў напладзілі столькі варыяцыяў сымбаляў рыцарскай рамантыкі, што можна разгубіцца.

Апроч прапанаваных варыянтаў, можна зьвярнуць увагу на вопраткавы фэтыш — розныя знаёмыя і незнаёмыя твары ў вас на майцы ці сукенцы. Ламаграфія, шаўкаграфія, поп-арт — партрэты, якія вы будзеце насіць на сабе, могуць адлюстроўваць вашы асабістыя прыхільнасьці або быць ня больш чым стылёвымі дэталямі.

## «Ёсьць у нашым у калгасе прыгажуня слаўная...»

Прэч урбанізацыю — летам мы едзем на вёску да бабулі, на лецішча да сяброўкі, у лес, на луг, мора, возера і раку! А гэта значыць, што можна дастаць з шафаў шырокія блюзкі з бавоўны, топы з карункамі, сялянскія сарафаны ў дробную кветачку, сукеначкі ў гарошак, спадніцы, пад якімі загуляецца вецер. Чым больш знойдзеце вінтажных шортаў і кашуляў — тым весялей будзе праходзіць ваш загарадны адпачынак. Можна нават правесьці спаборніцтва на колькасьць бабуліных рэчаў, якія зоймуць годнае месца ў вашым модным гардэробе. Толькі абавязкова памятаць, што вінтаж заканчваецца там, дзе заканчваюцца і актуальныя для сёньняшняй моды дэталі. А там ужо пачынаецца сэканд-хэнд.

## Карлсан, які жыве паўсюль

Летні сэзон — ён жа сэзон *лётны*. Здымаем з карлсанаў камбідрэсы — і паляцелі астываць ад сьпёкі ў аблоках. Сёлета толькі самы лянівы мадэльер не паказаў паміж астатніх сваіх вынаходак якую-небудзь варыяцыю камбінэзону. Праца, вечарынка, глямурная тусоўка ці

## АПЫТАНЬНЕ НА САЙЦЕ NN.BY

**Дзе вы плянуеце правесьці адпачынак?**

| | |
|---|---|
| Паеду на мора | 19 (24.4%) |
| Выпраўлюся ў горы | 4 (5.1%) |
| На беларускіх курортах | 4 (5.1%) |
| У бацькоў у вёсцы (ці на лецішчы) | 14 (17.9%) |
| Адпачываць не зьбіраюся | 37 (47.4%) |

Усяго прагаласавала: 78

нават спатканьне ля ракі Сьвіслач — цяпер ёсьць камбінэзоны для любой жыцьцёвай аказіі. Шорцікі і безрукаўка, лёгкі шоўк, які хавае ад сонца ўсё цела, або нават карункавы камбінэзон — гэта, відаць, яшчэ і вельмі зручна. Нават калі камбінэзоны заселяць усе вашыя шафы, не забывайце пра тры летнія сылюэты, маючы якія, нашмат прасьцей выбірацца з дому. Па-першае, сукенка-пэплас — найчасьцей з шоўку ці шыфону — трымаецца на адным плячы і перавязваецца на таліі. Па-другое, доўгі топік з высокай таліяй і аголенай сьпінай. І па-трэцяе, вядома ж, спадніца-аловак вышэй за калена. Дызайнэры сьцьвярджаюць: маючы гэтых траіх, вы не прапусьціце лета міма!

### Купальле must go on!

Калі вам падабаецца ваш леташні купальнік — нічога і не прадпрымайце, лішнія грошы лепш патраціць на сродкі для загару, тым больш, што якасная «сонечная» касмэтыка каштуе нямала. Аднак тым, для каго выбар новага купальніка — справа прынцыповая, варта ведаць, што гэтым летам ізноў актуальныя паласатыя купальнікі з марской і акіянічнай атрыбутыкай. Палосы ў асноўным гарызантальныя, а вось іх колер і шырыня — цалкам на ваш густ. Палосы здаюцца нецікавымі — набывайце купальнік з кветкавымі матывамі. Буйныя і яскравыя экзатычныя кветкі або дробная трапічная зеляніна добра выглядаюць на проста і сьціпла пашытых купальніках. Калі вы хочаце быць глямурнымі, выбірайце купальнікі агрэсіўныя, залатыя, з імітаванай леапардавай або зьмяінай скуры, сьмела адкрытыя, асымэтрычныя, эратычныя... Толькі памятайце, што глямур — гэта высокі кошт. Набываць падробную раскошу на Чэрвеньскім рынку вельмі непажадана.

### Пахі і смакі

Нягледзячы на тое, што шалёна моднымі робяцца моцныя і складаныя водары, усходнія і шыправыя (напрыклад, Euphoria ад Calvin Klein, Hypnose ад Lancome і Lovely ад Сары-Джэсікі Паркер), а на топе парфумавых гіт-парадаў побач з традыцыйным Chanel № 5 апынуўся Armani Code для жанчын, цёплы і пачуцьцёвы водар-двайнік мужчынскай вэрсіі, летам парфума павінна значна *аблегчыцца*. Салодкія, гаркавыя, глыбокія пахі варта пакінуць да восені, а пакуль прыдбаць нешта сьвежае, ненавязьлівае і кісла-салодкае.

Нашы смакавыя і водарныя прыхільнасьці цесна зьвязаныя. Таму, выбіраючы летнюю парфуму, падумайце, чым вы любіце перамагаць гарачыню і ласавацца ў цяньку. Можа быць, халоднай кавай з мускатным арэхам (Ice Men ад Thierry Mugler), ці ананасамі і мангавым марозівам (Sunset Heat ад Escada), або мандарынкамі і экзатычнымі ягадкамі лічы (Very Irresistible Summer Sun ад Givenchy). Раней смакавыя ноты былі толькі садавінавымі, але цяпер можна знайсьці самыя разнастайныя матывы: ад крэм-бруле да белай шакаляды. Мая сяброўка так і робіць: прыходзячы ў парфумавую краму, «замаўляе» розныя смачнасьці і заўсёды задаволеная абраным пахам.

Будзьце шчасьлівыя гэтым летам, не забудзьцеся пабегаць басанож, наведаць канцэрты і фэстывалі, пажыць у намётах, налавіць рыбы, надыхацца морам, паглядзець чужыя краіны і прыгожыя гарады. Каб ні пра што не шкадаваць увосень, калі мы ў чарговы раз застынем у роздуме перад расчыненай шафай.

# «Бабры» сабралі дзесяць тысяч

Пра найбуйнейшы ў Беларусі рок-фэстываль піша **Сямён Печанко**.

2 чэрвеня ў Бабруйску прайшоў музычны фэстываль «Рок за баброў». Нягледзячы на холад, паслухаць «Ляпіс Трубяцкой», «J_Mors», «Безь білета» сабралося дзесяць тысяч слухачоў.



GENERATION.BY

Міхалок з «Капіталам».

Сёлетні фэстываль меў акрэсьленую экалягічную скіраванасьць. Дамінаваў зялёны колер, ён жа — колер сымболікі бабруйскай піваварні «Сябар», сталага спонсара фэсту. У часе канцэрту ўсе мелі магчымасьць абмяняць плястыкавыя пакеты на палатняныя торбачкі з сымболікай фэстывалю. Ахвочыя мянялі два коркі ад піва «Бstriped» на стыкеры-сардэчкі і флаеры. За адзін флаер пасьля давалі зялёны гелевы балёнік. Потым па камандзе тыя балёнікі гледачы адпусьцілі ў неба. Вось вам і экалягічная акцыя.

Пры набліжэньні да канцэртнай пляцоўкі кінуліся ў вочы шчыльныя рады міліцыі. Непадалёк дзяжурыў зялёны аўтазак. Апека канцэртаў нават не «забароненых» выканаўцаў робіцца традыцыяй — мясцовыя журналісты казалі, што на фэсьце дзяжурыла ўсё бабруйскае кіраўніцтва: ад старшыні гарвыканкаму да кіраўніка бабруйскага КДБ.

Беларуская мова на фэстывалі гучала зрэдчас. Пабеларуску паміж песьнямі гаварылі смаленчукі з гурту «Deimos», пераможцы леташняга «Рок-кола». «Безьбілетнікі» прасьпявалі некалькі радкоў на роднай мове. Цягам гадзіннага выступу «J-Mors» толькі аднойчы засьпявалі па-наску.

Завяршаў праграму «Ляпіс Трубяцкой» з сваім «Капіталам». Сяргей Міхалок вітаўся з гледачамі пабеларуску, паміж песьнямі чытаў вершы паэта, «што лечыцца ў ЛТП», прысьвячаў песьню «асуджаным жанчынам з гомельскай папраўчай калёніі №4», ды прыгадаў невядомага сярэднявечнага мудраца, які «яшчэ тады выказваў актуальную ў наш час ідэю замяніць усялякія эгіпэцкія піраміды ды сады Сэміраміды на шкляныя бібліятэкі і лядовыя палацы».

Бабруйскія півавары, відаць, самыя музычныя ў краіне. Апроч «Баброў», яны падтрымліваюць фэст этна-музыкі «Вольнае паветра», што пройдзе ў Крупках 14 ліпеня.

**Сямён Печанко**

# Хто такі чарвяк

Чытайце часопіс «Маладосьць» і вы трапіце «Ў дзяржаву шчасьця / Дзе любяць краскі / Дзе кажуць «Здрасьце!» У газэце «Свабода» піша Алег Аблажэй.

Усё-такі шкодна быць адарваным ад Бацькаўшчыны. Зусім не ўяўляеш, што там робіцца. Калі ўся інфармацыя — з розных «Свабодаў» ды «Рацыяў».

Але што ўзяць з наймітаў ЦРУ? Найміт ён і ёсьць найміт, падачкі адпрацоўвае. Вось і распаўсюджваецца паклёп, нібыта ў Рэспубліцы Беларусь пісьменьнікі перасварыліся-перагрызьліся міжсобку.

Ды нездарма мудры народ кажа — у маны ногі кароткія. І праўда дайшла да мяне — у выглядзе двух, на жаль, выпадковых нумароў часопіса «Маладосьць» — 11.06 і 01.07.

А гэта не абы якое выданьне, а «Лучший общественно-политический и литературно-художественный журнал».

І што вы думаеце? Дзе раскол? Дзе сваркі?

Пад адной і той жа бліщчастай вокладкай — і Альгерд Бахарэвіч, і Анатоль Бутэвіч, і іншы Анатоль, бо Зэкаў! Валянціна Коўтун! Сам Георгі Марчук!

І нават член Савету Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, дэпутат Парлямэнцкага сходу Саюзу Беларусі й Расеі, намесьнік старшыні Камісіі па дэмаграфічнай бясьпецы і сацыяльным разьвіцьці Ала Ралькевіч са шчымлівымі вершамі пра зямлю сваіх бацькоў!

Гартаеш далей — а на цябе пазірае мужна-інтэлігентны твар Адама Глёбуса. Ня сам піша, а пра яго пішуць, — пра ягонага лірычнага героя, што пад «ціскам соцыюму спрабуе наладзіць кантакт зь іншымі людзьмі».

А тут не героі, а самі пісьменьнікі бязь ціску нясуць соцыюму свае сэрцы на далоні. Як мой любімы паэта Зьміцер Вішнёў:

клоп на балотах выклікае халодны пот
крот ашыляецца сярпом —
у яго сапсаваны рот
спорт паядаецца нібыта гэта салодкі торт
порт разбураецца бо вынайдзены
чарадзейны грот

Прачытаеш — самому хочацца штосьць падобнае сачыніць! (А што, пакуль дапішу, мо нешта й атрымаецца.)

Паэзія ў «Маладосьці» ўвогуле слаўная, а як жа іначай, калі часопіс рэдагуе «выкшталцоная паэтка» Раіса Баравікова. Узровень мусіць быць!

Стары мастак парве мальбэрт,
Штрыхі зьляцяцца на паперу.
Асадку возьме ён, паэт
Напіша «Тайную вячэру».

Парве мальбэрт… Мальбэрт — гэта такое прыстасаваньне з драўляных брускоў 6х4 см. Уяўляеце роспач мастака, які нават ня ломіць, а рве сваю прыладу! Гэта ж трэба давесьці да такой роспачы творцу… І трэба ўмець такі адчай перадаць адным радком!

Слабо так напісаць розным рыгорам-генадзям ды іншым нілам! Хай топчуцца ў сваім «Дзеяслове». І іншым не перашкаджаюць.

Бо ў краіне — лад. Лад і стабільнасьць.

«Лад» — так называўся адмысловы дадатак да «Литературной газеты» (нешта не відаць яго цяпер). Пісалася там, як «живется весело, вольготно в Белоруссии!» І знайшоў я там вершы знаёмага аўтара — Татьяны Сапоч. Дай, думаю, пацешу чалавека, павіншую з выхадам да ўсесаюзнага чытача. А тая як раскрычыцца, нагамі затупае, газэту вобзем — маўляў, ведаць ня ведаю і ведаць не хачу ніякага «Ладу» і нічога туды не давала!

Вось і зразумей ты гэтых жэншчын.

Даўно мару зьмяніць арыентацыю на больш сучасную, ды ня ведаю, з чаго пачаць…

А ў маладосьцевым «суквецьці талентаў» — і Алесь Разанаў. Цікава, хто яго віншаваў з публікацыяй? І чым гэта скончылася?

Словам, збываецца мара паэта, надышоў час, «когда письменники, все распри позабыв, в единую семью соединятся!»

Кароча, як кажа мой сусед, выпісвайце, чытайце «Маладосьць», і вы трапіце, паводле аднаго з аўтараў,

У краіну казкі
У дзяржаву шчасьця
Дзе любяць краскі
Дзе кажуць «Здрасьце!»
Жыве эРБЭ!

**P.S.** Пракляты склероз! А пра чарвяка забыўся… Адна мая знаёмая ела яблык, дый каўтнула разам паразыта. І нават ня зморшчылася. А што, кажа, — хто такі чарвяк? Той жа яблык, толькі перапрацаваны.

Вось і «Маладосьць» — той жа часопіс, толькі…

Абы калёрыі. Ды каб не званітавала.

**P.P.S.** А вось, як абяцаў, і вершык:

крот зьеў дрот
думаў бутэрброд
наклаў у порт
кі ля грам шпрот
аў аў ай да
Зьміцер ай да мала
дзец піз
анская вежа
духоўная
ежа

**Газэта «Свабода»**

## НОВЫЯ КНІГІ

# Гісторыя і гісторыя культуры

**Баженова, Ольга. Радзивилловский Несвиж. Росписи костела Божьего Тела.** — Минск: Харвест, 2007. — 416 с.: ил., 16 л. вкл.

Насамрэч, ад былой бліскучай культуры Радзівілаў у Нясьвіжы засталося ня так ужо і шмат. Пабудовы замку–палацу, кляштар бэнэдыктынак, езуіцкі касьцёл, Слуцкая брама — гэта толькі фрагмэнты былой велічы. Страчаныя карціны, мэбля, кнігі, строі, інтэр’еры пакояў замку… Адзіным аўтэнтычным сьведчаньнем раскошы ансамбляў гораду і рэзыдэнцыі зьяўляецца інтэр’ер касьцёлу Божага Цела, які захаваў аздобу XVI—XVIII ст. і ўнікальны выгляд.

Дасьледчыкі ўжо адзначалі, што шэдэўры позьнебарочнай культуры Рэчы Паспалітай можна знайсьці не ў галоўных урбаністычных асяродках Польшчы, а ў пэрыфэрыйных цэнтрах Вялікага Княства Літоўскага ды Валыні. Бо на гэтых землях жылі самыя багатыя і самыя шчодрыя мэцэнаты, самыя таленавітыя і самыя арыгінальныя мясцовыя мастакі.

Нясьвіскія росьпісы паказваюць той асаб–

# Алесь Камоцкі: «Шумеў чарот...»

Новы дыск барда Алеся Камоцкагабудзе складацца зь беларускамоўных вэрсіяў савецкіх песень.


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

«Песень кшталту «Мы построим БАМ» у альбоме няма. Самая агрэсіўная з усіх — гэта «Летят перелетные птицы». Ну, а калі «Утомленное солнце» — песьня савецкая, значыць, і астатнія савецкія! — кажа аўтар. — Дадаецца баян, скрыпка, клярнэт, саксафон, мандаліна і раяль. Песьні самі па сабе старыя і патрабуюць такога выкананьня. Адзінае што, песьні ўспрымаюцца трохі нязвыкла, бо ўсе на мове. Але гэта нават цікава. Прынамсі, хлопцы доўга радаваліся, калі пачулі перакладзены «Шумел камыш». Раптам у ёй дадалося шчымлівага трагізму.

Маё пакаленьне вельмі многа слухала гэтыя ўсе песьні... гэта сапраўды вельмі нядрэнныя песьні! Вось я і вырашыў перасьпяваць некаторыя, пакуль памятаю».

**music.fromby.net**

## ДАСЛАНЫЯ Ў РЭДАКЦЫЮ

лівы стан культуры Эўропы і ВКЛ XVIII ст., калі эўрапейскае адзінства дасягнула найвышэйшага ўзроўню ва ўсьведамленьні сваёй цэльнасьці і рытарычнага служэньня высокім мэтам і ідэалам. За гэтым пераваламі не прымусілі сябе чакаць зьмены, зьвязаныя з фармаваньнем у XIX ст. рэгіянальных нацыянальных культураў.

**Корзо, Маргарита. Украинская и белорусская катехетическая традиция конца XVI—XVII вв.: становление, эволюция и проблема заимствований.** — Москва: «Канон +», 2007. — 672 с.: 5 ил.

Катэхізісамі не вычэрпваецца ўсё багацьце рэлігійнай кніжнасьці тае эпохі, але менавіта яны былі адрасаваныя самым шырокім колам вернікаў, а таму маглі мець найбольшы сацыяльны эфэкт. Маскоўская дасьледчыца аналізуе ўкраінскія і беларускія катэхізісы ўсіх хрысьціянскіх канфэсіяў (каталіцкія, пратэстанцкія, праваслаўныя, грэка-каталіцкія). Маргарыта Корза робіць выснову, што праваслаўныя катэхізісы ў Рэчы Паспалітай узьніклі ў канцы XVI ст. у атмасфэры рэлігійнай палемікі, найперш з пратэстантамі, а ўжо толькі потым з каталікамі. Гэта быў пэрыяд своеасаблівага дыстанцыяваньня, калі важней было адмежавацца ад апанэнта, чым сфармуляваць сваю пазыцыю.

Рэгулярны зварот праваслаўных аўтараў да зьнешніх, у адносінах да іх традыцыі, крыніцаў, магло сьведчыць пра значную адкрытасьць, але таксама і неаформленасьць іх канфэсійнай сьвядомасьці. Гэта быў пэрыяд, які можна назваць эпохай станаўленьня і самавызначэньня ўкраінскага і беларускага праваслаўнага багаслоўя. У XVII ст. менавіта праваслаўныя тэолягі Рэчы Паспалітай аказвалі ўплыў на расейскіх інтэлектуалаў. У далейшым наступіла ўніфікацыя паводле маскоўскіх узораў.

**Мэтрыка Вялікага Княства Літоўскага: Кніга 560 (1542 год):** Кніга перапісаў № 3 (копія канца XVI ст.) / НАН Беларусі, Інстытут гісторыі; падрыхтаваў Алег Дзярновіч. — Менск: Беларуская навука, 2007. — 157 с.

Гэта кніга канцылярыі ВКЛ прысьвечаная падарожжу. 22 студзеня 1542 г. ля возера Курчум дзеля дэмаркацыі мяжы спаткаліся камісары ВКЛ і Інфлянтаў. Яны падзяліліся на дзьве групы — адна паехала на Захад, «да мора Салёнага», другая на Ўсход, «аж да граніц Маскоўскіх». Гэта было сапраўдным падарожжам у край, які для харністаў XVI ст. усё яшчэ заставаўся крыху загадкавым і часам прыгадваўся ў паўмітычным кантэксьце.

**Алег Дзярновіч**

# Суседзі пра Ўласава

Выйшла кніга «Волат зь Мігаўкі», прысьвечаная жыцьцю і дзейнасьці першага рэдактара «Нашай Ніва» Аляксандра Ўласава. Яна належыць пяру літаратуразнаўцы Ўладзімера Содаля.

«Пра жыцьцё Ўласава створаны розныя дасьледаваньні, артыкулы, нарысы, — піша У.Содаль. — Засталіся сьціслыя ўспаміны самога Ўласава. А вось якім ён запомніўся суседзям — мігаўцам, пра гэта яшчэ нідзе ніколі ня згадвалася. Уласаў паўстае перад намі ў самых розных праявах: часам наіўны, часам надта даверлівы, як дзіця, але чуйны да людзкіх клопатаў, да іх патрэбаў».

Мігаўка пры яго жыцьці была асяродкам асьветы, культуры. Сюды прыяжджалі яго паплечнікі, аднадумцы. У Мігаўцы ладзіліся вечарыны, ставілі «Паўлінку», «Раскіданае гняздо».

Пасьля аб'яднаньня Беларусі Ўласаў спадзяваўся быць патрэбным сваёй краіне, марыў далей выдаваць газэты, разьвіваць асьвету. Спадзяваўся атрымаць хоць маленькую, але заслужаную пэнсію ад улады. Але замест гэтага быў палічаны ворагам народа, арыштаваны.

Выданьне аздоблена рарытэтнымі фатаздымкамі. Кніга зьмяшчае гутаркі, успаміны, замалёўкі, якія, як багатая мастацкая кінастужка, адлюстроўваюць усю карціну эпохі, усё высакароднае, сьветлае і трагічна страчанае…

**Эла Оліна**

# Кніга пра сутнасьць XX стагодзьдзя

Раман Джорджа Оруэла «1984» найлепш з усіх кніг передае сутнасьць XX стагодзьдзя, лічыць брытанская газэта «The Guardian». Яе экспэрты мелі на выбар 50 кніг. У першай дзясятцы апынуліся таксама «Сэрца цемры» Джозэфа Конрада, «Гронкі гневу» Джона Стэйнбэка, «Над прорваю ў жыцьці» Джэрома Сэлінджэра.

Прафэсар англістыкі Джон Малэн зь Лёндану кнігу Оруэла назваў «дыяграмай сучаснай тыраніі».

Антыўтопію «1984» Оруэл напісаў у 1949 г. Аўтар прааналізаваў прынцыпы функцыянаваньня камуністычнай сыстэмы, выяўляючы мэханізмы дэнатурацыі мысьленьня і мовы. Шмат прыдуманых Оруэлам выразаў — «Вялікі Брат», «навамоўе», «падвойнае мысьленьне» — увайшлі ў гутарковую мову.

**Вольга Данішэвіч**

# І пра футбол

**Працяг са старонкі 16.**

гульнях. Месца ў «васьмёрцы» ў хакеі гарантаванае, мінімум, яшчэ некалькі гадоў. Беларускія майстры вялікай ракеткі стабільна выступаюць на турнірах АТР.

## Кансыстэнцыя Вагнэра

Вось толькі з футболам, які палымяна любяць мільёны заўзятараў, праблемы. То бок з футболам таксама даўно ўсё зразумела. Ні беларускім камандам у клюбных турнірах, ні нацыянальнай зборнай у адборачных турнірах чэмпіянатаў Эўропы і сьвету нічога, што называецца, ня сьвеціць. Толькі самыя заўзятыя аптымісты маглі яшчэ падлічваць шанец зборнай Беларусі перад матчам са зборнай Баўгарыі ў Сафіі пасьля поўнага правалу ў Менску.

Беларускія спартовыя камэнтатары зь вялікім задавальненьнем камэнтуюць матчы Лігі Чэмпіёнаў і ЎЭФА, а таксама ангельскай, гішпанскай, нямецкай ды іншых нацыянальных супэр- або экстра-лігаў. Ня кажучы пра матчы фінальнай пулькі Кубку сьвету. Яны дэманструюць бліскучае веданьне біяграфіяў замежных зорак футболу, а таксама іхных сваякоў, каханак, знаёмых сваякоў і г.д. А таксама выказваюць сябе знаўцамі футбольнай тактыкі й стратэгіі трэнэраў, разьбіраюцца ў дрыблінгу ды тонкасьцях распасоўкі, ведаюць стан калена або зьвязак на левай і правайназе амаль кожнага гульца.

Пры гэтым ня будзем кранаць мову й моўны запас нашых футбольных ды іншых спартовых камэнтатараў. Канстатуем толькі, што ніхто зь іх даўно не карыстаецца дзяржаўнай беларускай мовай у сваіх рэпартажах (хоць часам любяць ужыць дарэчна і недарэчна якое-небудзь беларускае слоўца). Што тычыцца асаблівасьцяў камэнтароў на расейскай мове, дык яны, збольшага, апісваюцца ў кнізе «Цяжкасьці расейскай мовы». Вось толькі адзін з маленькіх шэдэўраў, пачутых нядаўна з вуснаў вядомага футбольнага камэнтатара: «Мяч свечей взмывает под куполом стадиона».

Але ж калі даводзіцца весьці рэпартаж з матча нацыянальнай зборнай, ды яшчэ на родным стадыёне, кудысьці ўвесь патас і эрудыцыя камэнтатараў зьнікаюць. Зьнікае й слоўны запас. Дзеяньні футбалістаў апісваюцца пераважна ў наступных катэгорыях: «Ну, што ж ты!? Куды?...Эх! Ну!!! Як так можна?!...» і г.д. Тактычныя меркаваньні трэнэра ўяўляюцца камэнтатарам суцэльнай невытлумачальнай загадкай, а турнірная будучыня зборнай — «туманнай». Хаця які ўжо там туман на пачатку лета, за год да чэмпіянату Эўропы?

Аднак, не забываючы пра абавязак перад гледачамі, футбольныя камэнтатары імкнуцца зрабіць свой рэпартаж больш разнастайным і пачынаюць разважаць на тэмы, якія ня маюць простага дачыненьня да футболу.

Так, у матчы Беларусь — Баўгарыя іх зацікавіў баўгарскі футбаліст на прозьвішча Вагнэр, зь цёмным колерам скуры. Абодва камэнтатары некалькі разоў з задавальненьнем адгукнуліся наконт выгляду гульца, называючы яго «вельмі цікавым баўгарскім футбалістам», «калярытным». А адзін нават заявіў, што Вагнэр вылучаецца ня толькі сваім прозьвішчам, але й… «кансыстэнцыяй» (!)

Праявы расізму сустракаюцца на футбольных палёх усяе Эўропы. Гэта праблема. Праз выказваньні асобных футбалістаў наконт прычоскі альбо формы носу спаборніка спыняліся матчы. Італьянскага гульца, які ўскідваў руку на полі ў нацысцкім вітаньні, дыскваліфікавалі й штрафавалі. Дыскваліфікоўвалі цэлыя стадыёны пасьля расісцкіх лёзунгаў на трыбунах. Але пачуць расісцкія выказваньні з вуснаў спартовых камэнтатараў, ды яшчэ на дзяржаўным тэлеканале…

## «Краіну трэба ратаваць»

Беларускім камэнтатарам пашчасьціла, што іх чулі толькі айчынныя заўзятары. Гэтаксама пашчасьціла Аляксандру Ціхановічу, які падчас трансьляцыі быў адным зь вядучых апошняга конкурсу «Эўрабачаньня». Пра выканаўцу з Сэрбіі, якая ў выніку заняла першае месца, артыст некалькі разоў сказаў: «А я думаў, гэта карэйскі хлопчык». Пашчасьціла яму таму, што гэты камэнтар ня мела магчымасьці пачуць публіка ў Хэльсынках, Бялградзе, Пусане, у шмат якіх яшчэ месцах плянэты.

Гэты жарт, відавочны, спадабаўся і асноўнаму вядучаму, які ня толькі не зрабіў суразмоўцу заўвагу наконт, мякка кажучы, некарэктнасьці падобных выказваньняў, але й сам адпускаў кепікі ў падобным стылі.

Не выпадае выхоўваць вядучых і артыстаў — дарослых людзей, у якіх за плячыма ёсьць пэўнае выхаваньне, адукацыя, практыка. Калі густу й такту няма — яго й ня будзе. Вось толькі незразумела адно. Калі сучасная эўрапейская эстрада, прасьцей кажучы, папса зь яе сучаснымі брэндамі, у тым ліку модай на нетрадыцыйную сэксуальную арыентацыю, выклікае такую гідлівасьць у нашых журналістаў і артыстаў — навошта ўвогуле ўдзельнічаць у такіх конкурсах, як «Эўрабачаньне»? Навошта паказваць яго ў сваёй краіне? Навошта ехаць у Хэльсынкі немалой камандай, улучна з журналістамі, за дзяржаўны кошт? Каб чарговы раз даць адпор «уплыву» Захаду? А Калдун, значыць, ёсьць сымбалем славянскай эстэтыкі, якая процістаіць заняпаду заходняй цывілізацыі?

На пытаньне журналісткі адной беларускай эфэм-станцыі, пра што ён думаў на сцэне, выступаючы ў паўфінале, Дзіма Калдун адказаў: «Што краіну трэба ратаваць». Маладому сьпеваку, прынамсі, уласьцівыя іронія й самаіронія, у яго захавалася нармалёвая самаацэнка. Старэйшаму пакаленьню артыстаў, якія моляцца адразу двум багам — Мамоне і Палігімніі (у старажытных грэкаў муза Палігімнія адказвала за мастацтва хваласьпеваў) — нармальнай самаацэнкі яўна не хапае.

Кампэнсуецца гэты комплекс непаўнавартасьці выпадамі на адрас чужога выгляду, чужой культуры, расы, сэксуальнай арыентацыі. І называецца гэта вельмі проста: адсутнасьць культуры. Так бы мовіць, «у савецкіх уласны гонар».

Зьвярнулі ўвагу на адну дэталь перад матчам Беларусь — Баўгарыя? Нацыянальны гімн Баўгарыі сьпявалі амаль усе футбалісты зборнай, ды яшчэ падпявалі заўзятары на трыбунах. Гімн Рэспублікі Беларусі (крыху перапрацаваны гімн БССР) не сьпяваў амаль ніхто зь беларускай зборнай. І на полі футбалісты ў чырвоных майках і зялёных трусах паводзілі сябе так, быццам ня ведаюць — хто яны, адкуль і што робяць на полі. У адрозьненьне ад каманды баўгараў, дзе ўсё — ад Дзімітара Бербатава да чарнаскурага Лусіё Вагнэра — гулялі, як нацыянальная зборная, з годнасьцю й упэўненасьцю ў сабе.

## Беларусы прадалі матч баўгарам?

Днямі румынскія СМІ паведамілі, што футбольная зборная Баўгарыі, магчыма, здабыла ў Менску перамогу неспартовымі мэтадамі. Гэта ўжо ня першае абвінавачаньне нашай каманды ў «зьліве» матчаў. Нагадаем, беларусы ўдома саступілі баўгарам 0:2. Рэдактар газэты «Прессбол» Уладзімер Беражкоў таксама амаль пэўны, што матч быў дамоўленым. Паводле яго словаў, за гэта гавораць і сытуацыя на полі, і тая лёгкасьць, зь якой баўгары забілі галы. А вось Сяргей Аляхновіч з «Салідарнасьці» лічыць падобныя вэрсіі бздурай.



## Ураджэнец Беларусі будзе прэзыдэнтам Ізраілю

Ляўрэат Нобэлеўскай прэміі міру, віцэ-прэм’ер Шыман Пэрэс (**на фота ўнізе**) заявіў пра намер удзельнічаць у выбарах прэзыдэнта Ізраілю. Гэта будзе другая спроба 83-гадовага палітыка заняць пост кіраўніка дзяржавы. Выбары адбудуцца 13 чэрвеня. Улада ў Ізраілі належыць прэм’ер-міністру, роля прэзыдэнта цырыманіяльная.

Шыман Пэрэс (Перскі) нарадзіўся 1 жніўня 1923 г. у Вішневе (сёньня Валожынскі р-н). У 1934 г. сям’я Перскіх выехала ў Палестыну. Калі Пэрэса абяруць прэзыдэнтам, гэта будзе трэці прэзыдэнт краіны (ня блытаць з прэм’ерамі!) — ураджэнец Беларусі. Пасьля Хаіма Вэйцмана (Моталь, 1949—1952) і Залмана Шазара (Мір, 1963—1973).

## Скандал у «Дзьвюх зорках»

Народны артыст Беларусі Мікалай Скорыкаў застаўся верным свайму абяцаньню і ня выйшаў на сцэну ў гала-канцэрце мэгапраекту АНТ «Дзьве зоркі». Ён ня верыць, што за ягоны дуэт з дырэктаркай Цырку прагаласавалі толькі 2 тысячы чалавек. Тацяна Бандарчук ягоны дэмарш падтрымала.

Тым часам АНТ рыхтуе некалькі новых вялікіх канцэртаў, у тым ліку «Ноч агню» ў Мірскім замку і «Купальле з Ірынай Дарафеевай». А вось тэлешоў «Кароль рынгу», дзе б баксіравалі вядомыя асобы, у Беларусі ня будзе. Прадусары палічылі, што сэгмэнт людзей, якія захапляюцца боксам, невялікі.

## Школьнік сутэнёр

Дзесяцікласьніка адной са школаў Жлобіна затрымалі сталічныя праваахоўнікі: юнак спрабаваў вывезьці за мяжу дзяўчат для сэксуальнай эксплюатацыі. 17-гадовы хлопец зьвёў групу мянчанак, каб вывезьці ў Маскву. Там у яго было шмат знаёмых у забаўляльных клюбах. Урвіс знаходзіў дзяўчат праз інтэрнэт-сайты знаёмстваў.

## У праваслаўных пачалася Пятроўка

4 чэрвеня, празь сем дзён пасьля Сёмухі, пачаўся Пятроў пост. Ён устаноўлены ў памяць пакутнікаў сьвятых Пятра і Паўла. На загад імпэратара Нэрона тысячы хрысьціянаў былі ўкрыжаваныя, спаленыя, каменаваныя і аддадзеныя на зьдзеньне зьвярам. Сярод іх былі і сьвятыя апосталы. Самая вялікая працягласьць Пятровага посту — шэсьць тыдняў, самая малая — восем дзён. У Пятроўку можна есьці рыбу ўсе дні, акрамя серады і пятніцы.

## Берасьце разрастаецца

У склад гораду перададзеныя сёлы Аркадзія, Бярнады, Вычулкі, Гершоны, Казловічы, Кацельня-Баярская, Міцькі, Машчонка, Новыя Задворцы, Плоска і Старыя Задворцы.

## Міліцыянты выкарысталі дзяўчыну як нажыўку

30 траўня з Горадні ў Гомельскую турму этапавалі 20-гадовую Маргарыту Ц. Былая студэнтка 1-га курсу псыхалёгіі атрымала 4 гады за збыт 0,28 грамаў марыхуаны. Яе выкарысталі, каб падлавіць гандляра наркотыкамі, выкладчыка ВНУ Андрэя З. Міліцыі прасьцей выкарыстоўваць як «нажыўку» простых людзей, чым укараняць у наркаасяродзьдзе сваіх супрацоўнікаў. Аднак у выніку часам простыя спажыўцы наркотыкаў трапляюць за краты нібыта за гандаль.

## Чавэс адмяніў уступныя экзамэны

Прэзыдэнт Вэнэсуэлы працягвае



экстравагантнасьці. «Уступныя іспыты — састарэлы мэтад, які выключае магчымасьць атрыманьня вышэйшай адукацыі для моладзі з народных масаў, — заявіў Чавэс. — Таму ўступныя іспыты адмяняюцца». Студэнты адказалі бурнай радасьцю.

## Забароненае купаньне ў пяці рэках і азёрах

Купацца забаронена на рацэ Цна (Берасьцейшчына), на возеры Алтускае Маларыцкага раёну, у зоне адпачынку «Басэйн» Пружанскага раёну, у Дзьвіне ў Полацку. Таксама нельга купацца на пляжы Жлобіна, на Дняпры.

## «Віталюр» — чэмпіён

У заключным матчы фінальнай сэрыі мужчынскага першынства краіны па баскетболу сталічны «Віталюр» перамог «Горадню-93» зь лікам 91:67. Вынік сэрыі — 3:2. «Віталюр» стаў трохразовым чэмпіёнам краіны (2005, 2006, 2007).

## Мяса кракадзіла ды стэйк страўса

Усё гэта можна купіць у Паставах. За 1 кг філе «Нільскага кракадзіла» трэба заплаціць амаль 150 тыс. рублёў. Але ж бяруць, бо сюрпрыз! — кажа прадавачка. Яшчэ часьцей купляюць стэйк страўса, якіх гадуюць на прадпрыемстве «Навасёлкі-Лучай». 1 кг мяса каштуе 80 310 руб. Штодзень у гаспадарку, як у заапарк, едуць турысты. Яны каштуюць страўсяціну ў мясцовай кавярні, купляюць і яйкі. Адным такім можна накарміць цэлы ўзвод.

**Ул.інф., а таксама паводле інф. Эўрапейскага радыё для Беларусі, «Звязды», БЕЛТА, «РІА-Новості, БелаПАН**

# Капітал

Ляпіс Трубяцкой, 2007




Міхалок ужо ня той п’янаваты шансаньне з баянам.

Адзін з доўгачаканых альбомаў ад самай пасьпяховай айчыннай каманды, на якую яшчэ не ўзьнялася рука беларускага чыноўніка. У «Капіталу» музыкі робяць крок да больш жорсткай гітарнай музыкі ды нібы сур’ёзна зьвяртаюцца да тэмы антыглябалізму. Але пры гэтым працягваюць па-дзіцячаму выдурняцца, выказваць шчырую непрыхільнасьць да сыстэмы шоўбізнэсу і заігрываць з «фарматам». У адной зь песень пяецца: «Дзякуй Богу, што я не ў сыстэме», у другой — «Прости меня, котик, не уходи!» Дзіва, але іхны поп-панкаўскі нефармат запатрабаваны. Зайграў бы хто іншы песьню кшталту «Харэ» — ніколі бы ня трапіў у тэле- і радыёэфір. З гэтымі — сытуацыя іншая. Кплівая «Капітал» з прыпевам «У левай руцэ «сьнікерс», у правай — «марс», мой піяр-мэнэджэр — Карл Маркс» сталася гітом яшчэ да выхаду альбому, дзякуючы шалёным ратацыям на радыё і відэароліку з «удзелам» выявы Лукашэнкі.

У альбоме цяжка знайсьці налёт дваровасьці, з дапамогай якога музыкі калісьці здабылі посьпех, ды і Міхалок ужо ня той п’янаваты шансаньне з баянам, а харызматычны рок-лідэр з падкачанымі біцэпсамі. У «Ляпісаў» не выходзіць ствараць сумных песень, Міхалок пяе так, нібыта сьмяецца з усяго сьвету. На новым дыску «Ляпісы» перазапісалі беларускамоўную «Рамонкі» — адзін са сваіх асноўных канцэртных нумароў. Варта дадаць, што альбом запісаны пры ўдзеле гукарэжысэра, які працаваў над апошнім дыскам «Океану Ельзи». Выдатная праца з прэтэнзіяй на найлепшы рок-альбом году.

# Песьні Свабоды–3. Пл.Каліноўскага

складанка, Volia Music, 2007




Гэта больш, чым звычайны музычны праект.

Трэцяя частка самага папулярнага незалежнага праекту мінулай вясны. На дыску прадстаўленыя песьні, створаныя пад уражаньнем Плошчы. Кожны натхніўся пасвойму: былыя ліцэісты з «Партызанскай школы» зрабілі на свой лад аптымістычную «Freedom» Пола Макартні, рэпэры з «Чырвоным па Белым» раззлавана і бескампраміснa канстатавалі: «Людзі, як жывёлы». Хадановіч, як заўжды, адрэагаваў зь іроніяй: «А ў іх палатках — шпрыцы і порна, а ў іх бутэльках не кефір» — пяе ён на манер «Бэля Чао». А вось інструмэнтал «Плошча Каліноўскага» Віталя Артыста зь Bez Bilet’у гучыць як рэквіем. На складанцы — ня толькі прадстаўнікі розных стылёвых кірункаў, але і розных пакаленьняў. Гуру Вольскі і Кулінковіч тут суседнічаюць з пачаткоўцамі, якія ці ня той вясной-2006 упершыню ўзяліся за інструмэнт. Іх усіх яднае шчырасьць пачуцьцяў і чысьціня памкненьняў. І гэта ня той выпадак, калі трэба прыдзірацца да выканальніцкага ўзроўню і тэхнічных хібаў запісу.

«Песьні Свабоды» — гэта больш, чым звычайны музычны праект. Гэта Маніфэст, напісаны з дапамогай гітараў ды бубнаў, гэта — Крык душы, выяўлены з дапамогай скрыпак ды віяланчэлі. І гэта Вера ў лепшае, выказаная галасамі 24 удзельнікаў складанкі. Выдатна падсумоўвае ўсё выказанае апошні трэк у выкананьні Аляксандра Кулінковіча з праекту «Салідарны зь Беларусьсю»: «Свабоду не аддам ніколі!» Для ўсіх вальнадумных.

# Дударскі фэст

складанка, БМАгруп, НМК, 2007




Яшчэ б словаў ды электронікі — і «Эўрабачаньне» можна было б скараць.

Запіс леташняга фэстывалю, у якім узялі ўдзел выканаўцы і гурты, што ў сваёй творчасьці выкарыстоўваюць гэты старадаўні інструмэнт. Дуда толькі вяртаецца ў беларускі музычны ўжытак пасьля доўгага забыцьця, паступова разыходзіцца сярод ансамбляў старадаўняй музыкі, гучыць у рок-творах. У тым, што гучаньне дуды мае непаўторную экспрэсію, можна ўпэўніцца зь першага трэку — «Skudrinka» ад «LitvinTrol». Яшчэ б словы напісаць ды электронікі ўвесьці — і «Эўрабачаньне» можна было б скараць. Прыклад валоданьня тэхнікай ігры на гэтым інструмэнце дэманструе майстра — Тодар Кашкурэвіч (тут ажно чатыры кампазыцыі ў ягоным выкананьні). У кожнага выканаўцы дуда гучыць паразнаму: у «Келіх Кола» яна наганяе трохі суму, у «Провадах на вайну» Кашкурэвіча перадае трагічнасьць моманту, у «Ліцьвінаў» настройвае на добры лад. Прычым і дуды гучаць ня толькі беларускія, але і латыскія, шатляндзкія і галісійскія. Разынка гэтай праграмы — «Al Vis Lo Lop» ад «Старога Ольсы» з уплеценым музычным кавалкам зь «Nirvana». Тое, што падобная музыка мае попыт, давёў сёлетні дударскі фэст, які прайшоў нядаўна зь немалым посьпехам. Дыск прыдатны для азнаямленьня зь беларускай дударскай музыкай, хоць і ня лепшым чынам запісаны. Непадрыхтаванаму слухачу праслухаць яго будзе цяжкавата. Для аматараў сівой даўніны і тых, хто стаміўся ад гітарных «запілаў».

**Сяргей Будкін**



Мы зьбіраемся ў паход,
Робім з сырам бутэрброд.



Компас – у заплечнік,
І кацёл, канечне.

А яшчэ – намёты
Каб ня мёрзнуць потым.





І сякеру, і вяроўку,
Мы захопім у вандроўку.



А цяпер падкажы Капітану
Танаку і сябрам, якую рэч
ня варта браць з сабой
у вандроўку?





http://www.tanakaland.org

Капітан Танака ©

## ГЕОРГІ СТАНКЕВІЧ

* * *

Я вярнуўся дамоў, Айчына,
Не сышоў, не сканаў, ня зьнік.
Ты мне весьнічкі адчыні...

Урачыстых мэлёдый залішне,
Вось, матуля страчаць каб выйшла,
Больш нічога б я не хацеў…

*Старыя Ранчыцы*

## ЮЛІЯ ШАДЗЬКО

ВЕРШЫК З НАГОДЫ
ПАНУЮЧАГА НАДВОР'Я

У неба сёньня дэпрэсія —
Пярэстая,
Як галубы на весьніцах,
На лесьвіцах,
У падстрэшшы
Старым і дзюравым.
Неба ходзіць па бэльках
Сусьветнага даху,
Застылага, засыпанага
Жоўтымі фатаздымкамі
Жоўклага лісьця
Яшчэ з восені. Ды зрэшты
Ужо якую вясну
Не даходзяць (ці не падымаюцца)
Рукі прыбраць
Прыцярушаны лісьцем
Колішніх восеняў дах.

У неба дэпрэсія —
Зрэбная
Кашуля, заношаная
Процьмаю прошлых
І будучых гаспадароў.
Яе выкідаюць на сьметнік,
Рвуць з трэскам у рызьзё,
А яна вяртаецца, пошасьць,
Напамінкам колішняга або
Да болю знаёмымі
Лахманамі на чыіхсьці апушчаных
Плячах.

У неба дэпрэсія —
Веснавая, як закаханая
Жанчына, што весьціць
Аб сваім каханьні
Сьлязамі і сонечнымі
Промнямі, халадэчай
І воблакам квецені на вішні.

У неба дэпрэсія —
Нябеская,
Ды што тут скажаш,
Чалавеча.

*травень 2007*




**Агравыстава ў Менску.**

## ІМПРЭЗЫ

**Вольскі ў Горадні**

На **9 чэрвеня** заплянаваны новы канцэрт ў межах кампаніі «Музыкі супраць разбурэньня Горадні». Гэтым разам у Горадню прыедзе Лявон Вольскі. Пройдзе канцэрт **у памяшканьні Таварыства Беларускай Школы** (Будзёнага, 48а) **а 19-й**.

**s13.ru**

**Фота-аўтограф**

**8 чэрвеня з 17-й да 19-й ва Ўправе БНФ** (Машэрава, 8) пройдзе фота-аўтограф-сэсія гурту N.R.M. з нагоды выхаду новага альбому «06». Можна будзе падпісаць дыскі, набыць новы альбом, сфатаграфавацца з музыкамі. Уваход вольны.

## ВЫСТАВЫ

**Менск Анатоля Тычыны**

**У Мастацкім музэі** (вул.Леніна, 20) працуе выстава мастака-графіка Анатоля Тычыны «Мой Менск». А.Тычына — адзін з стваральнікаў беларускай графічнай школы XX ст.

**Італьянскае срэбра XX стагодзьдзя**

**У мастацкай галерэі «Унівэрсытэт культуры»** (Кастрычніцкая плошча, 1) **да 25 чэрвеня** працуе выстава «Ад дэкаратыўнасьці да дызайна: італьянскае срэбра XX ст.». Наведвальнікі выставы здолеюць пазнаёміцца з калекцыяй вырабаў са срэбра асноўных школаў і дызайн-студыяў Італіі, якія займаюцца вырабам твораў з каштоўных мэталаў: De Vecchi, Olga Finzi, San Lorenzo, Cleto Munari, Memphis, Gemma Gioielli.

## ФЭСТЫВАЛЬ

**Беларуская культура ва Ўроцлаве**

**4 — 10 чэрвеня ва Ўроцлаве** пройдзе Чацьверты фэстываль беларускай культуры. У праграме — музычныя вечары: ад року і бардаўскіх сьпеваў да джазу і клясыкі; літаратурныя — паэзія ды гісторыя; выставы жывапісу і прагляд дакумэнтальных фільмаў. Сярод гасьцей — Алесь Разанаў, Лявон Баршчэўскі, Андрэй Хадановіч, Віктар Жыбуль, Тацяна Беланогая, гурт «Індыга» ды іншыя.

Фэстываль ладзіць «Калегіюм Усходняй Эўропы», заснаваны Янам Новакам-Езяранскім у 2001-м. Гэтая няўрадавая арганізацыя мае на мэце наладжваньне кантактаў у сфэры культуры паміж краінамі Сярэдняй і Ўсходняй Эўропы. Фэстываль адбудзецца пры падтрымцы Рады міністраў Польшчы, польскага Міністэрства культуры, ваяводзкіх і гарадзкіх уладаў.

**Сямён Печанко, паводле Польскага радыё для замежжа**

## ТЭАТРЫ

**Купалаўскі тэатар**

**9 (сб)** — «Каханьне ў стылі барока».
**10 (ндз)** — «Вішнёвы сад».
**11 (пн)** — «Смак яблыка».
**13 (ср)** — «Макбэт».
**14 (чц)** — «Дзіўная місіс Сэвідж».
**16 (сб)** — «Парфён і Аляксандра».
**17 (ндз)** — «Я не пакіну цябе...».

*малая сцэна*

**8 (пт)** — «Адчыніце Кантралёру!».
**11 (пн)** — «Баляда пра каханьне».
**15 (пт)** — «Маці».
**16 (сб)** — «Саламея».
**17 (ндз)** — «Дзікае паляваньне караля Стаха».

## КІНО Ў МЕНСКУ

# Не прапусьціце: швэдзкія фільмы па-беларуску

У менскім кінатэатры «Цэнтральны» з 7 да 10 чэрвеня праходзіць фэстываль сучаснага швэдзкага кіно, прысьвечаны тэме жыцьця ў глыбінцы. Тэма выявілася сугучнай беларускаму мастацтву — і стужку Галіны Адамовіч «Мужчынская справа» ўключылі ў праграму фэсту. Прыходзьце, глядзіце й параўнайце!

7 ЧЭРВЕНЯ

**Так, як тут** (En plats som den har)

Швэцыя, 2006, 43 хв.

**Рэжысэры:** Андэрс Фэльман, Даніэль Свэрд

**Жанр:** Дакумэнтальны фільм

Тры мужчыны розных пакаленьняў — жыхары сельскай мясцовасьці Вэрмлянду, дзе на квадратны кілямэтар толькі тры чалавекі. Нягледзячы на асьляпляльныя краявіды, героі фільму сумуюць па іншым жыцьці…

**Мужчынская справа**

Беларусь, 2007, каляровы, 18 хв.

**Рэжысэрка:** Галіна Адамовіч

**Жанр:** Дакумэнтальны фільм

**Адзнака:** 7,5 (з 10)

Адвеку ў Беларусі музыкамі былі мужчыны. Бязь іх не абыходзілася ніводнае вясельле, ніводнае пахаваньне. У фільме — апошнія народныя музыкі беларускага Палесься — трыё «Вярэнька» столінскай вёскі Стахава…

Карціна — завяршальная частка трылёгіі, распачатай стужкамі «Божа мой» і «Завядзёнка». Фільм «Мужчынская справа» выклікаў рэзкае раздражненьне Міністэрства культуры (стужцы прысвоілі найніжэйшую катэгорыю) — працінае трагізмам сыходу.

Апошнія народныя музыкі — у эпоху магнітафонаў і радыё.

Вёска сыходзіць. Герой габлюе дзіцячую дамавіну… Бязладна гучыць пахавальны аркестар — а скрыпка на вясельлі ўжо згубіла майстэрства… Але ў душы гучыць сапраўдная музыка, а сьпевы ў храме ўзносяцца да неба.

Інтанацыяй карціна Адамовіч нагадвае фільм Асьлюка «Мы жывём на краі». Куды сыходзяць колішняе народнае майстэрства, старыя вёсачкі, скрыпкі, зробленыя сваімі рукамі?

Адамовіч ведае: у неба. Туды, дзе знаходзіцца вечнасьць.

А 18.30 адбудзецца паказ фільму й **сустрэча з рэжысэркай Галінай Адамовіч і прадусарам Зьмітром Плаксам**.

8 ЧЭРВЕНЯ

**Бывай, Фалькэнбэрг** (Farval Falkenberg)

Швэцыя — Данія, 2006, каляровы, 88 хв.

**Рэжысэр:** Еспэр Ганслант

**Жанр:** Драма

Апошнія лета ў мястэчку Фалькенбэрг. Галоўныя героі фільму – пяцёра сяброў дзяцінства, якія сталі юнакамі. Хаця будучыня маячыць на даляглядзе, нікога гэта не турбуе. Стужка пра сяброўства, успаміны й разьвітаньне зь мястэчкам ля мора…

Таксама адбудзецца **сустрэча з акторам Ёнам Эрыксанам і стваральнікам музыкі да фільму Эрыкам Энаксанам**.

9 ЧЭРВЕНЯ

**Чортавы правінцыялы** (Masjavlar)

Швэцыя, 2004, каляровы, 98 хв.

**Рэжысэр:** Марыя Блум

**Ролі выконваюць:** Сафія Хейлін, Кайса Эрнст, Ан Пэтрэн, Лаш Г.Арансан

**Жанр:** Камэдыя

Мія, якая пакінула дом дзеля жыцьця ў вялікім горадзе, вяртаецца ў мястэчка на 70-годзьдзе бацькі. Сьвяткаваньне ў мясцовым клюбе віруе. Тут і ўзгадваюцца старыя канфлікты…

10 ЧЭРВЕНЯ

**Віват, кароль!** (Tjenare kungen)

Швэцыя, 2005, каляровы, 90 хв.

**Рэжысэр:** Ульф Мальмрас

**Жанр:** Камэдыйная мэлядрама

Пасьля таго як Абрэ ня трапіла на канцэрт, яна пакідае сваё мястэчка і вырашае сама стаць рок-зоркай. Разам з панкам Міліянам яна стварае гурт…

А 21.00 — усе сэансы ў перакладзе на беларускую мову, а 18.30 — фільмы на мове арыгіналу з ангельскімі субтытрамі.

**Андрэй Расінскі**

## КАЛІ Б...

**...да канфлікту паміж ЗША і Расеяй аб прынцыпах разьмяшчэньня проціракетных сыстэмаў ва Ўсходняй Эўропе Менск падышоў з пазыцый шматвэктарнай дыпляматыі.**




— ...а атрыманыя ад арэнды зямлі грошы ўкладзем у новыя лядовыя палацы і мадэрнізацыю спэцназу.



## год паэзіі

Георгі Станкевіч.
«Я вярнуўся дамоў, Айчына» ................ 30

Юлія Шадзько.
Вершык з нагоды пануючага надвор'я 30

## Дыскаграфія

Капітал, Песьні Свабоды-3. Пл.Каліноўскага, Дударскі фэст. Старонка 28.




## «НН» СТО ГАДОЎ З ВАМІ

**З Бабруйскага пав. Ст. Вярхуціна**

19 мая ў тартаку Шульца забаставала каля 500 работнікаў. Главная прычына была вось якая: упраўляючы патрабаваў ад работнікаў, каб яны далі падпіску, што ніколі ня будуць дамагацца ад заводу грошай за калецтва работніка пры працы. На гэта работнікі сказалі, што такой падпіскі не дадуць.Іх ужо даўно вельмі ціснулі на тым заводзе, плата была дрэнная, дый дрэнна з работнікамі абыходзіліся. Вось і самі яны ўжо патрэбавалі ад гаспадара тартаку павялічыць плату за работу, скараціць рабочы дзень, даць лепшыя кватэры, збудаваць лазьню, а таксама зьмяніць упраўляючага і т.д. Пакуль гэтага ня будзе, пастанавілі саўсім ня йсьці на работу.

**С.Сяльчук.**

**«Наша Ніва». №7. 1907**




# А ты падпішыся!

**Каб рэгулярна атрымліваць «Нашу Ніву»,** проста паведаміце ў Рэдакцыю свой адрас. Аднaчасова Рэдакцыя зьвяртаецца з просьбай ахвяраваць на выданьне. Дэталі — **старонка 17.**

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

### ВІТАНЬНІ

**Віншуем** Алега, Юлію і Мікіту Дашкевічаў з нараджэньнем сына і браціка Яраміра! Сябры

### ШПАЦЫРЫ

**Ад 14 чэрвеня ў Віцебску** распачынаюцца шточацьвярговыя беларускамоўныя шпацыры ў навакольлі Дабравешчанскай царквы. Калі ласка, падыходзьце да 17.00, шпацыруйце на здароўе ды гаварыце па-беларуску, колькі душа просіць!

### ЛЕТНІК

**Археалягічны летнік** «Палатыда» запрашае на актыўны адпачынак летам у паўночнабеларускі рэгіён. Незабыўныя ўражаньні вам забясьпечаныя. Т.: 776-26-75

### РАСКОПКІ

**Добраахвотнікі** запрашаюцца на археалягічныя раскопкі ў Сьветлагорскім раёне. Добраахвотнікі могуць папрацаваць на першых раскопках у Шацілках — старадаўняй частцы Сьветлагорску, а таксама на раскопках у вёсцы Каралёва Слабада-2 — на месцы гораду Казімер. Т.: 567-59-22

### «БАСОВІШЧА»

**Арганізуецца паездка**! Т.: 622-57-20, 578-97-08

### КНІГІ

**Падкажыце**, дзе можна знайсьці/набыць копіі (DVD ці video) экранізаваныя творы беларускай клясыкі, напрыклад «Дзікае паляваньне караля Стаха» ды іншыя фільмы. jurha@op.pl

**Прапаную кнігі**: Поўны збор твораў Я.Купалы ў 9 тамах, Краўцэвіч «Тэўтонскі ордэн», Ластоўскі «Кароткая гісторыя Беларусі», «Беларускі кнігазбор», Арлоў, Ермаловіч, Шылер, Шэксьпір, Ажэшка, Ман, Сартр, Цвэйг, Грым, Булгакаў, Гётэ ды шмат іншага. Т.: 753-70-05

### СЯБРОЎСКІЯ ПАДАРОЖЖЫ

**Зьміцер Касьпяровіч запрашае** ў падарожжа «Гістарычная Астравеччына» 17 чэрвеня (нядзеля) па маршруце: Менск — Жодзішкі — Міхалішкі — Варняны — Трокенікі —Быстрыца — Войстам — Астравец — Менск. 22 — 25 чэрвеня: Львоў і замкі. 13 — 16 ліпеня: Грунвальд-Мальбарк-Гданьск. Т.: 292-54-58; 622-57-20; 509-12-16

## ПАШТОВАЯ СКРЫНКА

**Юрасю У. з mail.ru.** У рэцэнзіі на новы альбом NRM Вы амаль не выходзіце за межы апісаньня песень і правядзеньня паралеляў. Для спэцыялізаванага музычнага выданьня такое можа быць, але ў «НН» важны момант аналізу, вызначэньня месца альбому, кнігі, верша ў гіерархіі здабыткаў сучаснай культуры.

**Наша Ніва**
незалежная газэта

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991

**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914),
Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч,
У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі — Наста Бакшанская
шэф-рэдактар — Андрэй Дынько
галоўны рэдактар — Андрэй Скурко
мастацкі рэдактар — Сяргей Харэўскі
заснавальнік — Мясцовы фонд выданьня газэты «Наша ніва»
выдавец — Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32,**
**8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@nn.by**
**On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая.
12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Ф.Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня №581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220101, г. Менск, пр. Ракасоўскага, 102-71. Р/р 3012206280014 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск, код 764.

Наклад 2239. **Газэта выдаецца 48 разоў на год.**

Нумар падпісаны ў друк 23.00 06.06.2007.

Замова № 3079.

Рэдакцыйны адрас: Ракасоўскага, 102-71.